ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 54 (4306)
АУТОРАК, 8 сакавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

У міжнародны жаночы дзень пад сьцягам Камінтэрну работніцы усіх краін дэманструюць свае рэвалюцыйныя сілы для барацьбы за сусьветны кастрычнік, за абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны—СССР

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

8 сакавіка — дзень міжнароднай салідарнасьці працоўных жанчын усяго сьвету — праводзіцца ва ўмовах надзвычай узросшых супярэчнасьцяй паміж капіталістычным сьветам і краінай сацыялістычнага будаўніцтва. З катастрафічнай шпаркасьцю ў капіталістычных краінах пашыраецца эканамічны крызіс. Гэты крызіс асуджае на голад і жабрацтва дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, зьнішчаецца і без таго мізэрны жыцьцёвы ўзровень працоўных мас. Узмоцненая эксплёатацыя, самыя зьверскія рэпрэсіі ўжываюцца там, як меры «рацыяналізацыі», як меры выхаду з таго становішча, у якім апынуўся капіталізм. Капіталістычная рацыяналізацыя, асабліва цяжкім ярмом кладзецца на плечы працоўных жанчын.

У процілегласьць гэтаму становішчу рабочая кляса Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на чале з яе правадыром т. Сталіным, дабілася вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Бальшавіцкімі тэмпамі ажыцьцяўляецца індустрыялізацыя краіны. З посьпехам праводзіцца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму ў вёсцы—кулацтва як кляса.

Мінулы год знаменуецца завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу. Пытаньне «хто каго» канчаткова і беспаваротна вырашана на карысьць сацыялізму ў прамысловасьці [illegible]скай гаспадаркі. Краіна са[illegible]тага будаўніцтва ня ведае [illegible] Наўхільна паляпшаецца [illegible]-бытавы ўзровень пра[illegible].

[illegible]чніцкая рэвалюцыя падрэ[illegible]ні прыпячэньня і пяроў[illegible]ыцьцяк так глыбока, як ня ма[illegible]дрэзаць ні адна партыя, ні [illegible] рэвалюцыя ў сьвеце, але для сапраўднай роўнасьці яе з мужчынам трэба, каб была грамадзкая гаспадарка і каб жанчына прымала ўдзел у «гульнай вытворчай працы» (Ленін). Дасягнуты посьпехі ў справе індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі на аснове пяўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, у бязьлітаснай барацьбе супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левага» апартунізму і примірэнцтва, узьнята на нябывалую вышыню палітычная актыўнасьць і ўдзел працоўных жанчын у сацыялістычным будаўніцтве. У 1931 годзе ў прамысловасьці Савецкага Саюзу працавала 5,9 млн. работніц. Іх удзельная вага ў агвоўспах да ўсіх рабочых складае 33 проц. Больш 35 тыс. работніц працуе на кіруючай прафсаюзнай рабоце і звыш 1.000 работніц у цэнтральных кіруючых зьвеньнях прафсаюзаў.

Яшчэ больш высокая ўдзельная вага работніц у прамысловасьці БССР. У канцы 1931 г. па ўсёй прамысловасьці БССР работніцы складалі 39.849 чалавек, ці 40,7 проц., а ў бягучым годзе гэта колькасьць будзе даведзена да 63 тыс., што будзе складаць 47,3 проц. усёй колькасьці рабочых. Жанчыны-работніцы, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, з узьнятым творчым энтузіязмам змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, за высокія колькасныя і якасныя паказальнікі сацыялістычнай вытворчасьці, даючы сапраўдныя ўзоры ўдарнай работы. Паводле ўліку па 101 прадпрыемстве на 1 студзеня 1932 г. ахоплена ўдарніцтвам 67,5 проц. работніц. Па асобных прадпрыемствах удзел работніц у сацспаборніцтве і ўдарніцтве вышэй удзелу рабочых мужчын.

Па саюзе жывёлагадоўчых саўгасаў арганізаванымі гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі ахоплен 81 проц. работніц. У саўгасе «Боркавічы» жаночыя брыгады перавыконвалі на 70 і больш процантаў нормы на ўборцы ільну. Такія прыклады налічваюцца многімі сотнямі.

Надзвычай узрасла роля жанчын у калгасным вытворчасьці. У радзе месц асноўныя работы ў калгасах выконваюцца пераважна жаночай працай. Павышаная на аснове індустрыялізацыі машынаўзброенасьць сельскай гаспадаркі спрыяе аблягчэньню працы жанчын. На калгасных палёх Беларусі ўжо ў мінулым годзе працавала 1.140 трактараў, 6.740 жнівярак, 3.590 касілак, 3.150 конных грабель, 509 ільнеперабілак, сотні снапавязалак і інш. сельска-гаспадарчага інвэнтару. У часе веснавой пасеўнай кампаніі мінулага году арганізавана 2.132 дзіцячых ясьляй, 544 пляцоўкі і 546 сталовак. У бягучым годзе мяркуецца ахапіць дашкольнымі ўстановамі 316 тыс. дзяцей у горадзе і ў вёсцы.

Усё ў большай меры ўцягваюцца працоўныя жанчыны ў работу саветаў. У складзе гарсаветаў знаходзіцца каля 31 проц. работніц і сельсаветаў—24 проц. сялянак.

Сьвяткаваньне міжнароднага жаночага дня праходзіць пад лёзунгам мабілізацыі работніц і калгасьніц на пасьпяховае ажыцьцяўленьне гістарычных задач, вызначаных XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй і XIV зьездам КП(б)Б. Далейшы шпаркі рост прамысловасьці і павялічэньне ў вытворчасьці жаночай працы патрабуюць узмоцненага разгортваньня работы па аўладаньні тэхнікай, па павышэньні кваліфікацыі работніц. У такой-жа меры гэта задача адносіцца і да жанчын-калгасьніц. Неабходна ў большай ступені вылучаць па кіруючую гаспадарчую і адміністрацыйную работу лепшых ударніц на прадпрыемствах, саўгасах і калгасах. Асноўнай задачай, якая вырашае посьпехі на ўсіх участках работы, зьяўляецца поўная рэалізацыя 6 умоў т. Сталіна, уцягненьне работніц і калгасьніц у сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Павышэньнем тэмпаў работы за выкананьне прамфінпляну, за якасьць работы па вытворчасьці, узмоцненай работай на падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны, па выкананьні плянаў загатовак адзначым міжнародны жаночы дзень. Вынёй роло дэлегацкіх сходаў у горадзе і ў вёсцы, як прыводных пасаў ад партыі да шырокіх мас працоўных жанчын. Больш увагі далейшаму паляпшэньню культурных і бытавых умоў работніц і працоўных сялянак.

Умовы і задачы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць шырокага разгортваньня вызваўчай работы, мабілізацыі працоўных жанчын на барацьбу з клясавым ворагам, які аказвае сваё супраціўленьне разгортваньню сацыялістычнага наступленьня. Перадавых работніц і калгасьніц, лепшых ударніц неабходна ўцягваць у рады партыі, спалучаючы гэты рост з пяўхільным павышэньнем якасьці работы партарганізацый па выкананьні вытворчых задач.

Міжнародны камуністычны жаночы язэнь праводзіцца ва ўмовах узросшай пагрозы да нападу на СССР з боку капіталістычнага сьвету. Капіталізм шукае выхаду са свайго катастрафічнага становішча ў падрыхтоўцы новых войнаў, у арганізацыі інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Японскі імпэрыялізм, які па прапагу ўжо 5 месяцаў тэрарызуе ўзброенай сілай працоўныя масы Кітаю, марыць аўладаць Далёкім Усходам і Усходняй Сібірю. Прычым гэта авантура рыхтуецца з разьлікам на адначасовае выступленьне заходніх капіталістычных дзяржаў.

Савецкі ўрад пяўхільна праводзіў і праводзіць палітыку міру. Тым ня менш сучасныя падзеі патрабуюць асаблівай увагі, асаблівай пільнасьці да аховы межаў Савецкага Саюзу. Задача ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны павінна спалучацца з штодзённай, практычнай работай на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. На агрэсыўныя дзеньні і правакацыі імпэрыялістаў адкажам узмоцненай барацьбой за выкананьне задач чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, за ўзмацненьне абароназдольнасьці БССР — фарпосту Савецкага Саюзу.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі —да новых перамог!

Няхай жыве і мацнее міжнародная салідарнасьць працоўных жанчын усяго сьвету!

ЖАНОЧЫЯ БРЫГАДЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ ВЫСТУПАЮЦЬ НА БАРАЦЬБУ ЗА НАСЕНЬНЕ

Даб'емся перамогі на сацыялістычных палёх

ДА УСІХ КАЛГАСЬНІЦ, БЯДНЯЧАК І СЕРАДНЯЧАК—АДНААСОБНІЦ БЕЛАРУСІ

Адозва канфэрэнцыі калгасьніц Віцебскага раёну

Таварышы калгасьніцы і аднаасобніцы! Пастаўленая партыяй і ўладай задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца цэнтральнай у калгасным будаўніцтве і патрабуе мабілізацыі найшырэйшых працоўных мас на барацьбу за ўмацаваньне калгаснай вытворчасьці, за павышэньне таварнасьці, за высокую якасьць прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Мы—пазнаёмленкі трэцяй бальшавіцкай сяўбы, посьпех якое знаходзіцца ў залежнасьці ад таго, як мы да не падрыхтуемся, наколькі своечасова ўзброецца калгасы, бедняцка і серадняцтва для перамогі гранцыёзнейшай праграмы бальшавіцкай сяўбы.

Раяючым вучасткам за ўсёй падрыхтоўчай работе да веснавой сяўбы зьяўляецца арганізацыя насеньных фондаў. Гэта зараз адно з асноўных зьвенняў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Неўрадкай за ўсходніх рабах СССР абазначае нас—калгасьніц, бядняча і серадняча—аднаасобніц, арганізаваць дапамогу і ўзамадзеяньне калгаснаму сялянству шляхам рабіну праз выкананьне ўнутраных рэсурсаў.

Перадавыя калгасы нашага раёну—калгас імя Чарвякова, «1 мая», камуна «Іскра ленінская»—першымі ўзяліся за арганізацыю збору насеньня. Унутрыкалгаснай пазыкай, ажкалгасным абменам гэтыя перадавыя калгасы ліквідуюць прарывы ў сэкцыях насеньных фондаў; арганізаваныя жаночыя брыгады з калгасьніцаў, бедняцка-серадняцкіх—аднаасобніцаў зьбіраюць насеньне.

Мы зварачаемся да ўсіх калгасьніц, бядняча і серадняча шырока арганізаваць мінкалгасны насеньны збор і ўнутрыкалгасную пазыку, падтрымаць перадавыя калгасы, дружным фронтам рушыцца на барацьбу за насеньне.

ЦК УсеКП(б) паказаў, што вялікейшым зьяўленьнем у арганізацыі працы калгасаў павінна стаць брыгада. Гэта абавязвае нас—калгасьніц, бядняча і серадняча—аднаасобніц — узмацніць сілы на барацьбу за ажыцьцяўленьне пастаўленай партыяй задачы, што яшчэ больш замацуе калгасную вытворчасьць. Мы, удзельнікі канфэрэнцыі калгасьніц Віцебскага раёну, бяромся шырока папулярызаваць пастанову ЦК УсеКП(б) аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, разгарнуць работу па арганізацыі спэцыяльных жаночых брыгад даярак, жанцоў, пасольнічых і інш. у калгасах.

Мы разумеем, што калгасная брыгада—раяючае зьяўленьне ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Заклікаем вас, калгасьніцы, бядняча і серадняча—аднаасобніцы, вынёй узьняць арганізацыйную работу, пад кіраўніцтвам партыйных ячэек, за стварэньне калгасных брыгад, за рашучае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б)—даць рашучы адпор найменшым спробам пераходу ад арцельнай формы, якая сёньня зьяўляецца пануючай на сучасным этапе калгаснага будаўніцтва, на камуны.

6 указаньняў правадыра партыі таў. Сталіна ёсьць шлях да перамогі. Мы, удзельнікі канфэрэнцыі—калгасьніцы, бяромся ліквідаваць абязьлічку, палепшыць зьдзельнічыну ў калгасах, арганізаваць выканасе адысконіцтва калгасьнікаў. Шырокім штодзённым укараненьнем указаньняў таў. Сталіна ў калгасную вытворчасьць вынёй узьняць барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Калгасьніцы!

Умацаваньне калгасаў — гэта шлях да ліквідацыі бядняцтва, за вызвалічэньне, за ліквідацыю абязьлічкі, за ажыцьцяўленьне 6 указаньняў тав. Сталіна.

Мы, удзельнікі канфэрэнцыі, абвяшчаем сябе ўдарніцамі па правядзеньні трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

За рэалізацыю задач партыі ў калгасным будаўніцтве, за сапраўднае ўмацаваньне калгасаў, за рашучую барацьбу з куляцкім уплывам на адсталыя групы калгасьнікаў, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левага» загібаў, за падрыхтоўку пераможнай бальшавіцкай сяўбы—рушым усе свае сілы, усе памкненьні.

Калгас «1 мая», Сялюцкага сельсавету, Селязнёва Дар'я калгас «Прызыў», Барахлянскага сельсавету, Анастасься Чараўоўская; калгас імя Мархлеўскага, Руднянскага сельсавету, Заикавіч Вікторыя; калгас імя Дзяржынскага, Руднянскага сельсавету, Разанава Ганна; калгас «Малая Чарніца», Замастоцкага сельсавету, Ірына Бухаўцава; калгас імя Молатава, Бабінскага сельсавету. Н. Макарэнка; калгас імя Дзяржынскага, Руднянскага сельсавету, Надзея Грунтова; калгас «Малая Чарніца», Замастоцкага сельсавету, Матрона Забялецкая; калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсавету, за пяцісьменную Залтанову Юлію—Н. Макарэнка; калгас імя Молатава, Бабінскага сельсавету, за пяцісьменную Рубіну Матрону—Кісялёва; калгас імя Мархлеўскага, Руднянскага сельсавету, Жучкова Домна; калгас «Чырвоны Кастрычнік», Мошчанскага сельсавету. Т. Казлоўская; калгас «Перамога», Салюцкага сельсавету, Гулідава, за пяцісьменную расьпісваюся Кісялёва.

28 лютага 1932 г.
Віцебск.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Скончылі збор насеньня

МЕНСКІ РАЁН, калгас «Чырвоны барацьбіт» — **ВУЗЬДЗЕНСКІ РАЁН,** калгасы «Будаўнік» (Камінскага сельсавету), «Чырвоны штандар», «Чывоны пагранічнік» (Магільніцкі сельсавет), «Памяць Леніна», «Чырвоны Кастрычнік Прысынкаўскага сельсавету).

ТАЛАЧЫНСКІ РАЁН, калгасы «Беларуская вёска», «Чырвоны гарадзец», «Камуністычны шлях», «Прагрэс».

15 сакавіка пробны выезд перадавых

ТАЛАЧЫН, 5. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).

Абвешчаны райкомам партыі і райвыканкомам ударны месячнік зробіў вялікі пералом у справе пасьпяховай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Калгас «Камуністычны шлях», Мархлеўскага сельсавету, паказаў бальшавіцкі ўзор у падрыхтоўцы да сяўбы. Ссыпаны і ачышчаны насеньны і страхавыя фонды. На час сяўбы ў выстарчальнай колькасьці забраніраваны фураж, звыш 60 тон сіласу і 2.000 пудоў сена. Уся вучраж прывезена ў гатоўнасьць і замацавана за брыгадамі. Насеньне захоўваецца ў добра прыстасаваных для гэтага памяшканьнях. Кожную дзянку робіцца праверка яго становішча. Па падрыхтоўцы да сяўбы калгасьнікі Ананас Прахановіч, Раман Прахановіч, Вірага, Карначоў і інш. паказалі ўдарныя тэмпы работы, якіх праўленьне калгасу прэміявала Калгас узяў на буксір калгас імя Красіна.

Ня горшыя паказальнікі ў падрыхтоўцы да вясны мае і калгас «Прагрэс», Берагоўскага сельсавету, дзе таксама своечасова створаны насеньныя і страхавыя фонды. Кармамі калгас забясьпечан. Рэвізійная камісія калгасу зрабіла праверку насеньнага фонду. 15 сакавіка намечан пробны выезд у поле.

Козін.

Камсамольскія дазоры высокага ўраджаю

БАРЫСАЎ. (Па тэлеф.).

Усебеларускі агратэхнічны зьезд, які адкрыўся 5 сакавіка, Барысаўскі раён сустрэў са значнымі дасягненьнямі ў галіне аўладаньня агратэхнікай, у барацьбе за высокі ўраджай.

Прайшоўшая 1 агратэхнічная канфэрэнцыя дала штурмоўк для разгортваньня паходу за агратэхніку.

Некаторыя калгасы па-сапраўднаму ўзяліся за агратэхнічную вучобу. У калгасах Бытчанскага сельсавету арганізаваны агратэхнічныя гурткі, якімі ахоплены ўсе калгасьнікі.

Барысаўскі камсамол падхапіў пачынаньне Бузулуцкага камсамолу (Сярэдняя Волга) па арганізацыі дазору высокага ўраджаю. Камсамольская ячэйка калгасу «Рой» арганізавала 3 брыгады дазору па ачыстцы насеньня, рамонце інвэнтару і па падрыхтоўцы цягавай сілы і збруі. Уся камсамольская ячэйка і частка моладзі ахоплены гэтымі дазорамі высокага ўраджаю.

Сьледам за камсамольцамі калгасу «Рой» камсамольская ячэйка калгасу «Новае жыцьцё» арганізавала брыгаду дазору па ачыстцы насеньня. Дазоры працавалі ў 3 зьмены і дабіліся поўнай ачысткі насеньня.

Зараз райком камсамолу і райкалгасаюз заключылі сацыялістычны дагавор па падрыхтоўцы агратэхнічных кадраў для калгасаў. Камсамол абавязаўся даць 1.000 камсамольцаў на гэту работу.

Вядзецца зараз работа па падрыхтоўцы экскурсій у лепшыя калгасы Украіны для пераймаеньня вопыту агратэхнікі.

Усе калгасы раёну ўжо пачалі падрыхтоўку да гэтых экскурсій.

Н. Нэйдлін, Л. Гарэцкі.

Аб правядзеньні міжнароднага камуністычнага жаночага дня 8 сакавіка 1932 г.

З цыркуляру ЦВК Саюзу ССР

8 сакавіка 1932 году павінна прайсьці пад лёзунгам самага шырокага ўцягненьня працоўных жанчын усіх нацыянальнасьцяй у штодзённую вытворчую і культурна-бытавую работу разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і па ўмацаваньні абароназдольнасьці нашай краіны.

У гэтых мэтах прэзыдыум ЦВК СССР прапануе цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік у сувязі з міжнародным камуністычным жаночым днём 8 сакавіка.

1. Даручыць саветам і выканкомам, іх сэкцыям, дэпутацкім групам, брыгадам яшчэ шырэй уцягнуць працоўных жанчын у сыстэматычную і штодзённую праверку выкананьня пастаноў партыі і ўраду.

2. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ўсяго жаночага актыву ўсіх нацыянальнасьцяй на выкананьне прамфінпляну кожным прадпрыемствам, калгасам, кожным цэхам і кожнай брыгадай на аснове 6 умоў т. Сталіна.

3. Разгарнуць вылучэньне на кіруючую работу працоўных жанчын-работніц па праверцы выкананьня прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі заказаў для важнейшых будоўлаў і пралетарскіх цэнтраў.

4. Арганізаваць жанчын-калгасьніц на выкананьне чарговых задач веснавой пасеўнай кампаніі, складаючы з іх пераадавыя брыгады ўдарніц імя 8-га сакавіка 1932 г.

5. На важнейшыя вучасткі па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі вылучыць лепшыя ўдарныя групы і брыгады калгасьніц з тым, каб яны, паказваючы прыклады ўдарнай работы, узялі на буксір адстаючыя раёны.

6. Правесьці сярод работніц і калгасьніц кампанію за поўнае скарыстаньне мясцовых рэсурсаў у прамысловай і сельска-гаспадарчай вытворчасьці і за жорсткую эканомію ў выдаткаваньні дзяржаўных і калгасных сродкаў.

7. Арганізаваць работніц і калгасьніц на барацьбу за лепшыя якасныя паказальнікі ў вытворчасьці і сельскай гаспадарцы і па зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

8. Аказаць усямерную дапамогу ў ўцягненьні жанчын у Асоавіяхім, у арганізацыі Чырвонага крыжу, сацспаборніцтву і ўдарніцтву, актыўніцкам-работніцам па ўмацаваньні абароназдольнасьці СССР.

Арганізаваць праверку сіламі саміх работніц і калгасьніц работы дзіцячых ясьляй, пляцовак, садоў, сталовак, пральняй і інш. устаноў у мэтах далейшага яе паляпшэньня і тым самым вызваленьня працы жанчын і ўцягненьня іх у вытворчасьць.

1932 год — год выкананьня вялізарных гістарычных задач, якія будуць пяўхільна праводзіцца ў жыцьцё працоўнымі масамі ва ўмовах клясавай барацьбы, якая абвастраецца, і ўзмоцненых спроб імпэрыялістычнага сьвету парушыць мірную працу будаўнікоў сацыялізму ў Саюзе ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
ЕНУКІДЗЭ.

Да 2-га зьезду прафсаюзаў г. Менску

Другі менскі гарадзкі зьезд прафсаюзаў зьбіраецца пасьля XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, якія ў сваіх гістарычных пастановах далі разгорнутую бальшавіцкую праграму сацыялістычнага будаўніцтва, што абазначае «канчаткоўю ліквідацыю капіталістычных элементаў і класаў наогул».

Зьезд зьбіраецца ў момант, калі рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі, уступіла ў рашаючую барацьбу за ажыцьцяўленьне ўсіх заданьняў 1932 году — году скачэньня першай пяцігодкі і шырэйшай падрыхтоўкі да другой.

Год работы прафарганізацый Меншчыны — год разгорнутай барацьбы пад кіраўніцтвам партарганізацый за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна.

Цэнтральнае месца ў рабоце арганізаванага ў мінулым годзе гарадзкога савету прафсяюзных саюзаў заняла барацьба за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі — пяцігодка — за чатыры гады, за выкананьне плану трэцяга, рашаючага.

У выніку рашучага змаганьня з правазапартунізмам практыкай, **рад прадпрыемстваў датэрмінова выканалі прамфінплян трэцяга рашаючага** («Бальшавік», друкарня фаб-ка, імя Варобьёва), **некаторыя заводы скончылі пяцігадовы плян** («Кастрычнік», «Бальшавік», фабрыка імя Варобьёва). Значна павялічыліся капіталаўкладаньні ў прамысловасьць — да 7.552 тыс. руб. у 1931 г. Пропесвена рэканструкцыя ряду прадпрыемстваў («Усход, Камунарка»).

Усе гэтыя посьпехі паказваюць поўную рэалізацыю вызначаных плянаў. Аднак, плян трэцяга рашаючага па прадпрыемствах горану побачыць ня выкананым (86,2 проц.). Дзяржаве нададзена прадукцыі больш чым на 20 млн. руб. Асабліва нездавальняюча выкананы якасныя паказальнікі: па менскіх прадпрыемствах ВСНГБ сабекошт зьнізіўся на 3,9 проц. замест 8 проц., па прадпрыемствах Наркамкапабу ёсьць павялічэньне сабекошту на 1,8 проц., запаздываньне па ўзьвышэньні прадукцыйнасьці працы выканана на 10,7 проц., замест 33 проц. паводле плану, між тым плян росту зарплаты перавыкананы на 5,4 проц. (11 замест 5,6 проц.). Прычын недыкананьня заданьня трэба шукаць поўней ў наўмень [illegible]ні паасобных гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый перабудаваць работу па-новаму, на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна.

Адным з асноўных недахопаў у рабоце прамысловасьці ў 1931 г. зьяўлялася **дрэнная якасьць прадукцыі.** Факты ашрафаваньня фабрыкі «Кастрычнік» за прыпуску якасьці прадукцыі на 120 тыс. руб., звароту фабрыцы «1 мая» забракаваных шапак на 80 тыс. руб., фабрыцы «Усход» прадукцыі на 50 тыс. руб. гавораць аб бязьдзейнасьці, праяўленай гэтымі арганізацыямі ў барацьбе за якасьць работы.

Гарпрафсавет з першых-жа дзён сваёй работы ў 1932 са ўсёй рашучасьцю паставіў пытаньне аб паляпшэньні якасьці прадукцыі. У сваёй спэцыяльнай пастанове гарпрафсавет папярэдзіў ФЗМК аб тэй адказнасьці, якую яны нясуць за ажыцьцяўленьне якасных паказальнікаў. Гарпрафсавет заваструў пытаньне аб неабходнасьці злучыць барацьбу за якасьць з бязумоўным выкананьнем колькасных паказальнікаў.

Агульны рост прамысловасьці, асабліва лёгкай, рост заработнай платы, уцягненьне ў вытворчасьць жонак і ўтрыманцаў рабочых далі магчымасьць **значна палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочых мас.** Вырасьлі бытавыя ўстановы: пабудаваны новыя сталоўкі на заводзе «Камунар», «Дрэнажпрацоўшчык» і інш., адкрыты новыя ясьлі па фабрыках «Камункарка» і «Кастрычнік». Праз самы арганізаваны прадпуччанка ў мінулым годзе 6.282 чалавекі, з іх 90 проц. рабочых ад варштату, праз курорты і санаторыі прайшло звыш 500 рабочых. Арганізавана выдача сьветлячных абедаў непасрэдна на прадпрыемствах.

Стварэньне 11 ЗРК цэла магчымасьць ажыцьцявіць важнейшую дырэктыву партыі аб арганізацыі **пераважнага снабжэньня вядучых галін прамысловасьці.**

Перагтварэньне сталоўкі ў цэх харчаваньня зьяўлялася адной з асноўных задач **барацьбы за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня.** За мінулы год сетка сталовак павялічылася з 67 да 91. Там, дзе трыкутнікі эрэзумелі значэньне сталоўкі, як цэху вытворчасьці, там мы маем узорную пастаноўку работы і добрае абслугоўваньне рабочых (абутковая фабрыка, «Камунар»).

Новы склад гарпрафсавету павінен аднаўіць зьнішчаны прыбы ў рабоце па жыльлёвым будаўніцтве (замест 800 кватэр у 1931 г. пабудавана 216), рашуча палепшыць работу прачэчных і лазьняў, дабіцца пабудовы 2.000 новых кватэр, новай лазьні і пральні. Пытаньні жыльлёва-камунальнага будаўніцтва павінны стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх прафарганізацый.

«Задачы, пастаўленыя перад прафсаюзамі ў рэканструкцыйны перыяд, могуць быць выраішаны толькі пры карэннай перабудове работы прафсаюзных арганізацый» (з рэзалюцыі XIV зьезду КП(б)Б. Кіруючыся гэтай устаноўчай партыі і пастановамі V пленуму УсеЦСПС, Менскі гарпрафсавет зноў, пад кіраўніцтвам гаркому КП(б)Б, узначаліць рост палітычна-вытворчай актыўнасьці мас.

Месячнік перабудовы прафработы, перазыбары ФЗМК ператварыліся ў вялікую гаспадарча-палітычную кампанію, якая прайшла пад лёзунгам далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і найбольш хуткай рэалізацыі ўказаньняў **т. Сталіна.** У праверцы работы ФЗМК прымала ўдзел звыш 8.000 рабочых. У часе перавыбараў 883 лепшых ударнікаў уступілі ў рады партыі, 1.035 — у ЛКСМБ; лік ударнікаў павялічыўся на 5.378 чалавек, арганізавана 246 гаспадарча-разрахунковых брыгад, паступіла 2.286 рабочых рацыяналізатарскіх прапановаў.

Менск скончыў перавыбарную кампанію са значнымі посьпехамі, атрымаўшы сьцяг імя ЦКСБ. Перабудова работы прафсаюзаў-тварам да вытворчасьці выявілася ў наближэньні яе па зьместу зьвяна — цэху, брыгады. На 33 прадпрыемствах да перавыбараў было 463 прафгрупоргі, пасьля—802.

Посьпехі, дасягнутыя ў мінулым годзе, заваяваны дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, у бязьлітаснай барацьбе з рэшткамі троцкістскім і апартунізму ў паасобных прафсаюзных зьвеньнях.

Другі зьезд прафсаюзаў Меншчыны, у параўнаньні з якога стаць важнейшым пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, павінен намеціць баявую праграму барацьбы прафсаюзных арганізацый за выкананьне плану вялікіх работ чацьвертага, заключнага году, за далейшае ажыцьцяўленьне 6 умоў перамогі.

ШУЛЬКІН.

ВЫХАВАЎЧУЮ ПРАЦУ СЯРОД РАБОТНІЦ І КАЛГАСЬНІЦ СПАЛУЧАЦЬ СА ШТОДЗЕННАЙ БАРАЦЬБОЙ ЗА БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ

РАБОТУ ВЯСКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ СЯРОД ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН— НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ!

Узьняць якасьць выхаваўчай работы

Посьлех разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсіх франтох, якія характарызуюцца завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу, узьнімаюць усё на вышэйшую ступень творчую актыўнасьць рабочых і калгасных мас. Тысячы работніц па прадпрыемствах знаходзяцца ў перадавых ударных радох змагароў за выкананьне і перавыкананьне вытворчай праграмы, за высокую якасьць прадукцыі. Сотні і тысячы калгасьніц мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарництва змагаюцца за ўраджай, за высокую гаспадарчую эфэктыўнасьць калгаснай вытворчасьці, за выкананьне ўсіх задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Адным з паказальнікаў росту актыўнасьці і творчага энтузіязму жанчын-работніц і калгасьніц, паказальнікам росту аўтарытэту нашай партыі сярод найшырэйшых працоўных мас зьяўляецца ўзрослая цяга ў партыю. Колькасьць жанчын у складзе КП(б)Б за тры гады першай пяцігодкі павялічылася амаль у два разы. Калі па 1 студзеня 1929 году налічвалася ў арганізацыі КП(б)Б 3.928 жанчын, дык па 1 студзеня 1932 году гэта лічба павялічылася да 7.513 чалавек. Жанчыны ў арганізацыі КП(б)Б складаюць 12,7 проц. У агульным прыёме ў партыю за мінулы год павысілася ўдзельная вага работніц, тых працуюць непасрэдна па вытворчасьці.

Гэты рост патрабуе ад партарганізацый узмацнення палітычнага кіраўніцтва работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні партыйных мас у духу непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левага» апартунізму і ўсякіх праяўленьняў гнілога лібэралізму.

Барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі, за пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны і выкананьне плянаў загатовак пры ўмовах, калі неліквідаванае яшчэ канчаткова кулацтва аказвае шалёнае супраціўленьне, нямыслімa без сыстэматычнай масавай работы, і ў першую чаргу работы сярод калгаснага актыву.

Узмацненьне партыйнага кіраўніцтва работай делегацкіх сходаў у вёсны, работа з жаночым актывам у калгасах зьяўляецца неабходнай умовай для прыцягненьня жанчын-калгасьніц, бяднячак і сераднячак — адпаасобніц да больш актыўнага ўдзелу ў выкананьні чарговых задач партыі на вёсны. Лепшых ударніц-калгасьніц неабходна больш рашуча вылучаць на кіруючую работу, забясьпечваць імі вядучыя вучасткі калгаснай вытворчасьці.

Падчуваючы ў міжнародным жаночым камуністычным дзень пройдзены этап барацьбы за генэральную лінію партыі, кожная партыйная арганізацыя павінна ўзмацніць сваю работу па мабілізацыі працоўных жанчын на практычнае ажыцьцяўленьне гістарычных задач сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаных XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй і XIV зьездам КП(б)Б.

Узначаліць актыўнасьць калгасьніц

Многія делегацкія сходы (Асьвейскі раён) усю сваю работу падпарадкоўваюць правядзеньню важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, уцягваюць у гэту работу шырокія масы калгасьніц, бяднячак і сераднячак — адпаасобніц.

За мінулы год у калгасах значна павысіўся лік працадзён жанчын, асабліва ў часе ўборачнай кампаніі. У сярэднім па раёне ў старых калгасах на кожную калгасьніцу прыпадае па 200 працадзён у год. У некаторых калгасах («Красава», імя Сакко і Ван цэці, «Свабода» і інш.) выхад на работу складае звыш 90 проц. рабочых дзён.

Такая адказьнейшая кампанія, як уборка ільну, дзе жаночая рабочая сіла адыгрывае рашаючую ролю, скончана па Асьвейскім ільнаводчым раёне своячасова. Дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах «Прыазёрнае», «Курсава», імя Будзённага, «Свабода» і інш., жаночыя брыгады перавыкапалі на 40-50 проц. вытворчыя нормы па ўборцы ільну. Па ініцыятыве жанчын гэтых калгасаў былі арганізаваны буксірныя брыгады па 15-20 асоб у кожнай, якія дапамагалі адстаючым калгасам скончыць уборачную кампанію. У калгасе «Свабода», дзе з 35 працаздольных — 30 жанчын, своячасова ўбраны і апрацаван лён з 23 гэктараў, плян загатовак выкананы поўнасьцю. Па ініцыятыве делегацкіх сходаў калгасаў «На варце ленінскага шляху», «Авангард», «Прыазёрнае» і інш. было арганізавана 5 чырвоных абозаў бульбы, 2 абозы ільну і г. д.

Трэба адзначыць, што рост удзельнай вагі жаночай працы ў калгасах слаба быў падхоплен гэтымі арганізацыямі. Творчая актыўнасьць калгасьніц не заўсёды ўзначальваецца партыйчэйкамі. У раёне было праведзена 5 канфэрэнцый калгасьніц, на якіх выносілася шмат практычных прапаноў. Між тым каштоўныя матар'ялы канфэрэнцый ня толькі не рэалізаваны, а нават не даведзены да шырокіх мас калгасьніц.

Партыйныя ячэйкі, якія абслугоўваюць калгасы «На варце ленінскага шляху», «Авангард», «Рэйтэр-штэрн», не мабілізавалі своячасова калгасьніц на апрацоўку ільну. У выніку ў гэтых калгасах шмат ільну загінула.

У калгасах «Асьвея», «Прыазёрнае», «Авангард» і інш. брыгадзірамі вылучаны толькі мужчыны. З 17 калгасьніц, якія скончылі курсы трактарыстаў, толькі 5 працуюць па сваёй кваліфікацыі.

К.

Палепшыць падрыхтоўку навуковых кадраў з рабочых

Тав. Сталін у сваёй прамове рашуча паставіў пытаньне аб падрыхтоўцы **«вытворча - тэхнічнай інтэлігенцыі з рабочай клясы».** Адсюль асабліва важнае значэньне набывае пытаньне падрыхтоўкі навуковых кадраў з рабочых.

З гэтай мэтай пры Інстытуце Асьпірантуры БАН з восені 1931 г. створана **падрыхтоўчае аддзяленьне,** на якім з агульнай колькасьці вучняў—больш 75 проц. **рабочых непасрэдна з вытворчасьці** і 90 проц. партыйна-камсамольскага складу.

Пры арганізацыі гэтага аддзяленьня дырэктарыят інстытуту асьпірантуры меў на ўвазе падрыхтаваць кадры для асноўных курсаў інстытуту па грамадзкіх і фізыка-тэхнічных дысцыплінах.

Але-ж вучэбны плян па **фізыка-тэхнічнай** групе быў складзен так, што ў ім прадугледжваецца на працягу двох **год даць веды за вышэйшую школу** па наступных спэцыяльнасьцях: фізыцы, матэматыцы, біалёгіі, хэміі і дыялектыцы прыроды.

Практыка прайшоўшых 4 месяцаў вучобы паказала, што прайсьці за 2 гады некалькі спэцыяльных ВНУ немагчыма і што тыя, хто скончыць падрыхтоўчае аддзяленьне па фізыка-тэхнічнай групе, ня будуць у неабходнай меры падрыхтаванымі па вышэйпаказаных спэцыяльнасьцях.

Вельмі выразна гаворыць аб гэтым лік адведзеных гадзін па асобных дысцыплінах. Напрыклад: у фізыка-тэхнічным аддзяленьні БДУ на фізыку адведзена **1.300** гадзін (апрача цэлага раду іншых дысцыплін як: тэхналёгія мэталю, машынабудаўніцтва, гісторыя тэхнікі і інш.), а ў фізыка-тэхнічнай групе інстытуту асьпірантуры **толькі 750** гадзін.

У хэміка-тэхналёгічным інстытуце па хэмію адведзена **1.200** гадз., а ў фізыка-тэхнічнай групе інстытуту асьпірантаў толькі **360** гадз.

У біалёгічным інстытуце на біалёгію адведзена **1.300 гадзін,** а ў фізыка-тэхнічнай групе толькі **240** гадзін.

Аб гэтым ненармальным становішчы ўжо два разы ставілася пытаньне на вытворчай нарадзе групы. На апошняй нарадзе самой дырэкцыяй была прызнана наяўнасьць прарыву па падрыхтоўцы асьпірантаў па вышэйпаказаных спэцыяльнасьцях.

Ужо прайшло больш месяцу з часу апошняй вытворчай нарады, але-ж рашучых крокаў дырэкцыяй па зьнішчэньні ненармальнасьцяй і дагэтуль не прынята. Выкладчыкі па спэцыяльных дысцыплінах (т.т. **Успенскі, Сагалівіч, Некрашэвіч**) не рэагавалі на гэта нездаровае зьявішча ў фізыка-тэхнічнай групе. У апошнія дні дзьве вытворчыя нарады групы былі сарваны з прычыны няяўкі выкладчыкаў. Гэта сьведчыць аб тым, што выкладчыкі не **адчуваюць адказнасьці** за акадэмічную падрыхтоўку групы.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі Інстытуту Асьпірантуры і БАН, ня гледзячы на ўсе сыгналы, не рашуча рэагавалі на існуючае становішча ў фізыка-тэхнічнай групе.

Такое становішча ў фізыка-тэхнічнай групе кажа аб тым што існуе **пагроза зрыву падрыхтоўкі навуковых кадраў з рабочых.**

Таму патрэбны тэрміновыя рашучыя меры па перабудове работы і вучэбнага пляну фізыка-тэхнічнай групы падрыхтоўчага аддзяленьня.

Мы лічым, што канкрэтна трэба пра весьці наступнае:

устанавіць **дакладны профіль** фізыка-тэхнічнай групы па адной спэцыяльнасьці і ў адпаведнасьці з гэтым **перабудаваць** навучальны плян, каб дырэктыва дакладна ведала **каго яна рыхтуе,** а слухачы ведалі **на каго яны рыхтуюцца** і каб была належная **якасьць** падрыхтоўкі.

Забясьпечыць групу **пастаяннымі выкладчыкамі** і ўскласьці **персанальную адказнасьць** на кожнага выкладчыка **за акадэмічную** падрыхтоўку групы.

зьнішчыць абязьлічку ў кіраўніцтве групай з боку дырэкцыі. Дабіцца таго, каб група мела штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва.

Трэба, каб партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі інстытуту Асьпірантуры і БАН узмацнілі кіраўніцтва падрыхтоўчым аддзяленьнем.

КАУПАС, ДАРЭУСКІ, ГАРЭЛІК, БЕЛЮГА, ГОРБАХ, ЛАБАНАЎ.

Канкрэтнай справай

Партарганізацыяй Рэчыцкага раёну шырока разгорнута падрыхтоўка да міжнароднага жаночага камуністычнага дня. Падрыхтоўка праводзілася, пад экзам мабілізацыі працоўных жанчын гораду ў вёскі на барацьбу за выкананьне вытворчых праграм. За час падрыхтоўкі адкрыт рад новых дзіцячых ясьлей і садоў, на якія па раёне асигнавана каля 20.000 р.б.

У выніку масавай работы ў цэхах сярод работніц рэчыцкіх прадпрыемстваў шырока разгорнута спабоніцтва і ўдарництва, арганізаваны жаночыя гаспадарча - разрахунковыя брыгады імя 8 сакавіка. Лепшыя ўдарніцы падалі заявы аб устуленьні ў партыю і камсамол. На фабрыцы імя Х-ці-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі работніцы прынялі рад канкрэтных абавязацельстваў па ліквідацыі прагулаў, барацьбе з бракам і г. д.

Асабліва ўвага зьвернута на работу сярод калгасьніц. За час падрыхтоўкі па 8-га сакавіка ў радзе калгасаў («Салтанава», «Васіленічы», «Барнчоўка», «Заска» і інш) парт'ячэйкі арганізавалі ўдарныя жаночыя брыгады па ачыстцы насеньня, вырашы гною і г. д. У калгасах «Данцброт», імя Сталіна, імя Калініна і інш. лепшыя ўдарніцы вылучаны на адказную кіруючую работу — загатачыкамі сьвінагадоўчых фэрм, кіраўнікамі малочнай гаспадаркі, старшымі брыгадзірамі і інш. 18 калгасьніц-актывістак накіраваны на курсы трактарыстаў. 3 — на вышэйшыя калгасныя курсы, 50 — на курсы пашкольных работніц, 7 — на курсы загатачыкаў ясьлей.

Новік.

Аб калгасе „Чырвоная Зорка"

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б лічыць зусім недапушчальным, што Коханоўская ячэйка КП(б)Б, по праверцы фактаў на месцы, дазволіла распусьціць калгас «Чырвоная зорка», Асьвейскага раёну па тых матывах, што гэты калгас зьяўляецца вулацка-замоўным і ня выконвае сваіх абавязкаў перад дзяржавай. У сваю чаргу Асьвейскі райком КП(б)Б праігнаміраваў паміненую пастанову ячэйкі і ўвайшоў у ЦК з просьбай даць санкцыю на роспуск калгасу, таксама не ацэнаёўшы ня з калгасам. Між тым, абсьледаваньнем ЦК КП(б)Б устаноўлена, што з моманту арганізацыі калгасу (які складаецца ў пераважнай большасьці бедняцкай і частка серадняцкай) і да прыезду прадстаўніка ЦК ніхто з рабочых работнікаў і з сельсавету ў гэтым калгасе ня быў і сапраўдная становішча яго ня ведаў. РК КП(б)Б толькі пасьля пазвоньваньня калгасу «Чырвоная зорка» прадстаўніком ЦК сказаў свае рашэньня непрайільныя пастановы аб калгасе і пастаноўку ячэйкі па гэтым пытаньні.

Гэты факт сьведчыць аб адсутнасьці канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва калгасамі з боку Коханоўскай ячэйкі і Асьвейскага РК КП(б)Б.

Факт з падрыйным кіраўніцтвам калгасным бухгалтэрыяй у Асьвейскім раёне зьяўляецца сур'ёзным папярэджаньнем для раду іншых раёнаў, дзе гэтай справе не аддаецца належнай увагі.

З бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за 6 умоў тав. Сталіна—

ганаровы абавязак ударніц сацыялістычнай будоўлі

Працоўную жанчыну---у сацыялістычную прамысловасьць!

У сучасны момант пытаньне жаночай працы ставіцца як пытаньне максымальнага ўцягненьня жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, асабліва ў часе ўзрослай актыўнасьці шырокіх колаў работніц на выкананьне гаспадарча-палітычных задач.

На працягу апошніх год у краіне ўцягненьне працоўных жанчын у прамысловасьць БССР ёсьць значныя дасягненьні. Так, калі ў 1929 годзе ў рэспубліканскай прамысловасьці было занята 11.465 жанчын, дык гэта лічба ў 1930 годзе узрастае да 15.355 і ў 1931—да 23.000. У 1932 годзе колькасьць жанчын, занятых у рэспубліканскай прамысловасьці, павінна дасягнуць 50 проц. ад агульнай колькасьці ўсіх рабочых.

Усё больш і больш вылучаецца жанчын на высокакваліфікаваную працу.

Расьце палітычная актыўнасьць работніц, якая накіравана на выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм. Усё больш узрастае колькасьць работніц, ахопленых сацспаборніцтвам і ўдарництвам. Значна ўзрасла ўдзельная вага жанчын у гаспадарча-разрахунковых брыгадах, павысіўся іх гаспадарскі.

Тав. БАБЛЕВА — прэміраваная ударніца заводу «Полымя Рэвалюцыі».

У сучасны момант **адзіным** паказьніком ацэнкі работы прадпрыемстваў, арганізацый, установаў, прадпрыемстваў, арганізацый, установаў, прадпрыемстваў, арганізацый, установаў,

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа— прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

Бязьлітасна біць па дэмабілізацыйных настроях

8 сакавіка

За пяцігодку 25 лютага — 6 сакавіка процант заготовак збожжа не пасунуўся ні на адну дзесятую. У наяўнасьці ярка выяўленыя тэндэнцыі вгарнуць кампанію, дасягнуўшы ўсяго 89,5 проц. выканаўшы гадавога плану.

Што ляжыць у аснове гэтых тэндэнцый «стабільнасьці»?

Пясуменна, асноўная прычына заключацца ў тых дэмабілізацыйных настроях, якія значна пашыраны ў вузкай частцы кіруючых арганізацый большасьці раёнаў. Інакш польга вытлумачыць таго факту, што важнейшыя ў рэспубліцы збожжавыя раёны (Слуцак, Рагачоў і інш.). за апошнія тыжні загатаўляюць ня больш 0,1 проц. Яшчэ горш у іншых аясцях. Можна прывесьці дзесяткі раёнаў, якія за апошнюю пяцідзеўку не далі і пілёграму збожжа. Найбольш абураючым зьяўляецца той факт, што тэндэнцыі вгортваньня кампаніі большыя ігграе у тых раёнах (Чавусы—79 проц., Пінскі—89.5 проц., Асіпавіцкі—82 проц., Быхаўскі—78 проц., Чобаньскі—67 проц., Старадарожскі—48 проц.), якія стаяць на зусім нізкім узроўні выканаўшы гадавога плану. Яснка, што ў гэтых раёнах партарганізацыі за апошні час значна аслабілі барацьбу з апартуністычнымі элементамі, якія лічаць немагчымым выканаць «апошнія процанты» і імкнуцца этсім сьпіць збожжазагатоўкі.

Апартуністычная практыка з асаблівай сілай праяўляецца ў рабоце па спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка - заможных элементаў. Гэта частка плану выканана толькі на 48,2 проц.

Як і раней, адстае аднаасобны сэктар. Выкананьне плану аднаасобнікамі на 78,2 проц.—падзячай якія паказальнік таго, што імёны на гэтым участку дэмабілізацыйныя настрої прывялі да найбольшага аслабленьня работы.

Недавыкананьне збожжавага плану хоць-бы на адзін процант пазбаўляе краіну рэспубліку дзесяткаў тон збожжа і балоча ўдарыць па рабочым забесьпячэньні.

Апошнія процанты вырашаюць справу 100-проц. выкананьня рэспубліканскага плану. Таму рэалізацыя гэтых процантаў патрабуе асаблівага напружаньня сіл.

Мы наблізіліся да выкананьня плану, і тым хутчэй будзе завершана кампанія, чым больш учартасьці будзе праяўлена раённымі партарганізацыямі ў барацьбе за кожны процант плану, чым больш дружны бальшавіцкі адпор будзе дан дэмабілізацыйным настроям.

Перадавіком збожжазагатовак—прэміі

УВАРАВІЧЫ. (НАШ КАР.).

КАЛГАСЫ УВАРАВІЦКАГА РАЁНУ ДАБІЛІСЯ БУЙНОЙ ПЕРАМОГІ У ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ. ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН, ЯНЫ З ПОСЬПЕХАМ [illegible] ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ СУСТРЭЧ-

[illegible]ЕНУЛ УВАРАВІЦКАГА РАЙВЫКАНКОМУ З УДЗЕЛАМ [illegible]ЕТАУ, КАЛГАСАУ І САКРАТАРОУ ПАРТ'ЯЧЭЕК ПА[illegible] ЗА УДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ ПА ВЫКАНАНЬ[illegible] ПЛЯНАУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК В КАЛГАСАУ — [illegible] 150 РУБ., ДА 400 РУБ. ПРАМТАВАРАМІ. СЯРОД [illegible]АСЫ «РУХАВІК» ІМЯ ПЕРШАГА МАЯ, «ЧЫРВО[illegible] І ІНШ.

[illegible]ПРАЧА ТАГО ПРЭМІЯВАНЫ СТАРШЫНІ ЛЕПШЫХ СЕЛЬСАВЕТАУ.

А. КАЗІМІРАЎ.

Рэчыцкі раён усё яшчэ ў тыле кампаніі

РЭЧЫЦА.

Плян збожжазагатовак па Рэчыцкім раёне выкананы ўсяго па 84 проц.

Адстаюць ня толькі аднаасобны сэктар, але і калгасы. Апошнія недавыкапалі плану па 11 проц. Калгас «Герой працы» замест 1,1 тоны здаў толькі 0,47. Калгас «Камінтэрн» (Новы-Барсукі сельсавет) аднаведна—0,73 тоны і 0,16 тоны. Такі буйны калгас, як «Х год БССР», скаў заданьне па збожжы выканаў менш як на 50 проц. Ёсьць нават і такія калгасы, як «1 мая», якія не здалі яшчэ нівочага кілё збожжа.

Паказаныя лічбы сьведчаць аб тым, што многія раённые арганізацыі ня толькі не ўзмацнілі барацьбы за завяршэньне збожжазагатовак, але за апошні час аслабілі кіраўніцтва гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй і фактычна спынілі загатоўкі.

Па Рэчыцкім раёне ёсьць рад калгасаў, як імя Калініна, Дзяржынскага, Будзённага, «Піянэр» і інш., якія амаль у два разы перавыкапалі свае плякы.

Калгасы і сельсаветы раёну, якія адстаюць, павінны пасьледаваць прыкладу перадавікоў і ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца завяршэньня кампаніі.

Р. П.

Новыя калдагавары--у цэхі, брыгады, групы!

Рэалізацыяй 6 умоў тав. Сталіна ператворым калдагаворную кампанію ў магутны вагар барацьбы за скончэньне пяцігодкі ў 1932 годзе

Ударнікі фабрыкі „Кастрычнік" узмацняюць барацьбу з прастоямі і бракам

Задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам у апошнім годзе пяцігодкі, патрабуюць напружаньня ўсіх сіл і энэргіі рабочае клясы па пасьпяховае выкананьне прамфінпляну па ўсіх накавальнях, асабліва ў справе паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Асноўным злом у нашай працы зьяўляюцца прастоі і брак, якія зьмяншаюць пашы дасягненьні і перашкаджаюць пасьпяховай барацьбе за прамфінплян і якасьць прадукцыі.

Агульны сход рабочых, ІТР і служачых чырвонасьцяжнай швейнай фабрыкі «Кастрычнік», ухваляючы пастанову ЦВК і СНК Саюзу аб мерапрыемствах па заляпе прастояў і браку, адпадушна галасуе за 50 проц. аплату за прастоі і вылікі за брак да ½ тарыфнай стаўкі.

Гэта пастанова выклікае ў нас яшчэ большую зацікаўленасьць у барацьбе з прастоямі і бракам і прымушае адміністрацыю больш свядчасова забясьпечваць бесперабойную работу цэхаў, агрэгатаў, істужак.

Ва ўмовах капіэрнай сыстэмы ўсякі прастой нават на самым маленькім вучастку падрывае работу цэлага калектыву і перашкаджае выкананьню прамфінпляну. Тое самае наконт браку: адна бракаваная апэрацыя пагрэшвае якасьць усяго паліта і прыносіць значныя страты ўсёй фабрыцы.

Улічваючы ўсю важнасьць пастаўленых перад намі задач, мы рабочыя і ўдарнікі, абавязваемся павесьці рашучую барацьбу з прастоямі і бракам. Мы мабілізуемся на недапушчэньне прастояў, перарабак і браку і разам з нашай адміністрацыяй будзем усімі мэталамі дабівацца іх канчатковага зьнічэньня.

Мы ўпэўнены, што рабочыя швейнай прамысловасьці БССР і ўсіх іншых фабрык і заводаў, улічваючы важнасьць гэтых мерапрыемстваў, актыўна нас падтрымаюць, і таксама з бальшавіцкай упартасьцю бунуць праводзіць усе мерапрыемствы, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй у апошнім годзе пяцігодкі.

Па даручэньні агульнага сходу:

Сакратар парткому Кац.

Старшыня фабкому Коган.

Дырэктар фабрыкі Карасін.

Поўнасьцю зьнішчыць недахопы мінулага году

Калдагаворная кампанія на Навабеліцкім фанэрным заводзе «Вэзуві» праходзіць бяз дэтальнай праверкі прычын невыкананьня прамфінпляну. Часовая кантрольная камісія не завастрыла ўвагі рабочых на пытаньнях зьвторчых недахопаў, на пытаньнях невыкананьня абавязацельстваў адміністрацыі і рабочых.

Між тым, за 11 месяцаў 1931 году праграма выканана толькі на 75 проц. Прадукцыйнасьць працы замест узнаных 0,24 кбм. на чалавека, дасягнула толькі 0,19 кбм. Прагулы ў 1931 годзе складалі 2.739 дзён супроць 1.380 дзён у 1930 годзе. Па нэўважлівых прычынах на работу не зьявілася 4,6 проц. рабочых. Тэхнічныя перапыні дасягнулі 8.700 гадзін, пры чым сюды ўваходзяць перапыні з-за несвячасовай устаноўкі другой клеевай машынкі, з-за неналажанасьці абсталяваньня, недахвату пары і г. д. Брак па фанэры ў 1931 годзе ўзрос на 127 проц. супроць дапушчаных норм. Сабекошт павялічыўся на 33 проц. Часта пагаршаецца пэрадукцыйнае выкарыставаньне шары ў той час, як для парыльных камер яе не хапае. Адказнага за работу качагаркі няма. На шлымашынах, на клеольных вальцах, па прэсе робяць шмат браку з прычыны абязьлічанасьці работы. Улічваюцца толькі гатункі тавару, а якасьць сыраду і прычыны што выклікаюць брак, улічваюцца слаба. Часта з-за нядбайнасьці адцягальшчыц гатункі «А» ідзе ў «АБ». Не зварачаецца ўвага на якасьць адсартаваньня шпонаў, клейку фанэры і варку яе.

Бывае, што ў лісьце фанэры адзін бок гатунку «А», а другі—гатунку «Б» і, такім чынам, ліст ідзе ў нежэйшы гатунак. Часта фанэра паніжаецца ў якасьці з-за сарывога абразу цыркуляркі, або з-за таго, што фанэру складаюць пад шавоць і яна ад вільгаці псуецца.

Шмат рабочых прапаноў ня толькі ня выконваюцца, але і ня ўлічваюцца. Так, прапановы аб зьмяншэньні разьмеру мускачкоў для зашчоку калёс, што давала-б магчымасьць эканоміць цэлюлёзу, аб пабудове атвоснага транспартэра для ўборкі кары, нават не абгаворваліся.

Каля 30 проц. рабочых не атрымалі спэцвопратки, у агульным намішканьні бруд, не хапае пасьпяльных прылад, не вядзецца ніякай выхаваўчай работы. Пункт калдагавору аб пабудове лазьні ня выкананы. Ва ўсім гэтым выявілася яўнае ігнараваньне тых заматрабаваньняў, якія складаюць неабходныя ўмовы для выкананьня прамфінпляну.

Вось на ўсіх гэтых недахопах, на іх зьнічэньні павінна быць мабілізавана ўвага рабочых пры абгаварэньні новага калдагавору.

Я. Ісараў.

Як сьць прадукцыі—на першае месца!

Праверка выкананьня калдагавароў 1931 году паказала, што яшчэ ня ўсе трыкутнікі прадпрыемстваў Гомелю ўявілі сабе вялікую мабілізуючую ролю калдагавору ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну і паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых. На заводах імя Ланцуцкага, «Сацыялізм» і «Чырвоны хэмік» выкананьне абавязацельстваў адміністрацыі і рабочых не правярялася на працягу году. Нават у часе праверачнай кампаніі гэтыя прадпрыемствы слаба мабілізавалі рабочых па праверку старых і прапрацоўку новых калдагавароў.

Зусім інакш падыйшлі да праверкі калдагавароў трыкутнікі заводаў «Гомсельмаш», «Пралетары» і друкарні «Палесдрук». За час праверкі на заводзе «Пралетары» ўпесена звыш 400 прапаноў, на заводзе «Гомсельмаш»—374, у друкарні «Палесдрук»—68. Большасьць прапаноў — вытворчага характару. На заводзе «Пралетары» 26 рабочых добраахвотна зьнізілі расцэнкі.

Праверачная кампанія выявіла, што адзін з асноўных пунктаў калдагавароў—аб якасьці прадукцыі—амаль на ўсіх буйных прадпрыемствах Гомельшчыны ня выканан. Некаторы зрух у справе паляпшэньня якасьці прадукцыі ёсьць па заводзе імя Ланцуцкага, на аўчынна-футровым заводзе і фабрыцы «Праца». На фабрыцы «Герой працы» (Добруш) за 9 месяцаў мінулага году пляц па выпуску паперы першага і другога гатункаў быў недавыкананы на 550 тон у той час, як па выпуску трэцяга гатунку і продажнага браку плян павялічыўся на 594 тоны, або на 95,3 проц. На шэйнай фабрыцы «Камінтэрн» амаль па ўсіх цэхах пагаршаецца надзвычай вялікая колькасьць браку і перарабак. З прычыны адсутнасьці матар'яльнай адказнасьці, кантралёры выпускаюць прадукцыю дрэннай якасьці. Адзел тэхнічнага кантролю ніякага ўліку браку і перарабак не вядзе.

У часе праверкі калдагавароў высьветлена, што гаспадарнікі заводу «Пралетары» і фабрык «Камінтэрн» і «Праца» зварачалі невыстарчальную ўвагу на ахову працы. На ф-цы «Камінтэрн» калдагавор у адносінах правіл па ахове працы ня выканан поўнасьцю. Замест 15 пяцідзёвых фантаваў зроблены толькі два. У цэхах няма аптэчак, і рабочым прыходзіцца хадзіць на мэмпункт. На фабрыцы «Праца» ў некаторых мапшынах антэрмічнае агароджа; таксама не ва ўсіх цэхах ёсьць вэнтылятары.

Зараз прадпрыемствы Гомелю разгарнулі шырокую кампанію па перазаключэньні калдагавароў. Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны ўлічыць недахопы мінулага году і моцна ўдарыць па тых, хто нядбайна адносіцца да выкананьня канкрэтных умоў калдагавароў і парушае свае абавязацельствы.

Н. Гафт.

Арганізаваць усебеларускі ільняны абоз

Падхапіць пачынаньне Дрысы

Стварэньнем жаночых пастаянных брыгад па пераапрацоўцы забясьпечым хутчэйшае выкананьне пляну

Раўняцца па нормах лепшых трапальшчыц

Разрыў паміж пераапрацоўкай валакна і здачай—адзін з асноўных тормазаў у выкананьні пляну ільназагатовак.

Вопыт раду перадавых сельсаветаў, калгасаў паказаў, што там, дзе правільна арганізавана першапачатковая апрацоўка, дзе створаны пастаянныя брыгады, поўнасьцю выкарыстоўваецца ўвесь мяльна-сушыльна-трапальны інвэнтар, дасягнуты буйныя посьпехі ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і выкананьні заданьняў.

Як вядома роля жанчыны ў пераапрацоўцы ільнавалакна асабліва значная. Ва многіх калгасах, вёсках, жанчыны зьявіліся пачынальнікамі барацьбы за высокія тэмпы і нормы апрацоўкі, за здачу таварнай прадукцыі дзяржаве.

У калгасе «Перамога», Чырвонаалуцкага сельсавету, Лепельскага раёну, кожная ўдзельніца брыгады трапальшчыц выпрацоўвае ў дзень па 14 кгр. пры норме ў 8 кгр. Ударніца, селькорка Васілевіч з Засьцянкаўскага калгасу, Боеўскага сельсавету, бачачы прарыў у апрацоўцы ільну, арганізавала брыгаду з 20 жанчын, у тым ліку з 9 аднаасобніц, што дало магчымасьць калгасу скончыць апрацоўку. У калгасе «Шлях камунізму», Асьвейскага раёну, ударніца Асока Сьцепаніда трапала ў дзень па 16 кгр. пры норме ў 10 кгр. Брыгада трапальшчыц з калгасу «Вяжбожнік», Пагарэльскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, выпрацоўвае па 13 кгр. у дзень. У калгасе «КІМ», Плешчаніцкага раёну, дзе нормы па трапаньні прыняты ў 8-9 кгр., ударніца Майтан Стэфа дае ў дзень пры ручной апрацоўцы 20 кгр., а Майтак Маня і Лявіцкая—па 16 кгр.

Жаночыя ўдарныя брыгады высоўваюць ударныя нормы апрацоўкі.

Але ў той-жа час ёсьць шмат фактаў дрэннай, неарганізаванай работы, разбазарваньня таварнай прадукцыі на ўласныя патрэбы калгасьніц і калгасьнікаў.

Калгас «Прыазернае», Асьвейскага раёну, норму выпрацоўкі, вызначаную райкалгасаюзам у 10 кгр., зьнізіў да 4 кгр. У калгасе «Чырвоны маяк» працыцыпліна нізкая, вытворчыя нарады часта зрываюцца, рабочая сіла па пераапрацоўцы расстаўлена дрэнна.

Разрыў паміж апрацоўкай і здачай павінен быць ліквідаваны ў найкарацейшы тэрмін. Для гэтага трэба, каб парт'ячэйкі, сельсаветы скансэнтравалі больш увагі на разгортваньні масавай работы ў калгасным брыгадзе, сярод жанчын-трапальшчыц, на ўзмацненьне барацьбы з кулацкім уплывам сярод асобных груп калгасьніц і аднаасобніц, выкарыстоўваючы мэтады самаспаборніцтва, грамадзкага буксіру перадавікоў адстаючым і г. д.

Міжнародны жаночы дзень павінен быць выкарыстаны для мабілізацыі мас калгасьніц і аднаасобніц—бядняцкіх і сераднячак—на хутчэйшае выкананьне пляну ільназагатовак і ліквідацыю запазычанасьці дзяржаве. Кожная жаночая брыгада павінна мець дакладны апэрацыйны плян і заданьне.

У абвешчаны Дрысенскім раёнам ударны дзяднік завяршэньня ільназагатовак павінны ўключыцца ўсе раёны БССР, увязваючы ільназагатоўкі з мерапрыемствамі па падрыхтоўцы да сяўбы.

Максымальным фарсаваньнем пераапрацоўкі, арганізацыяй чырвоных абозаў, самаправеркай выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай неабходна дабіцца рашаючай перамогі на фронце ільназагатовак. Калгасьніцы і аднаасобніцы ў гэтай рабоце павінны прыняць асабліва актыўны ўдзел.

Дэкаднік завяршэньня ільназагатовак

ДРЫСА. (ПА ТЭЛЕФОНУ).

У ПАДАРУНАК ПЕРШАМУ УСЕБЕЛАРУСКАМУ АГРАТЭХНІЧНАМУ ЗЬЕЗДУ ДРЫСЕНСКІ РАЙКОМ ПАРТЫІ, РВК, РАЙКАЛГАССАЮЗ, ПАСТАНАВІЛІ АРГАНІЗАВАЦЬ РАЁННЫ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ІЛЬНАВАЛАКНОМ. З 7-ГА ДА 17-ГА САКАВІКА АБВЯШЧАЕМ УДАРНЫ ДЭКАДНІК ЗАВЯРШЭНЬНЯ ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ ДЭКАДНІК ПРАВОДЗІЦЦА ПАД ЗНАКАМ МАСАВАЙ САМАПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ І САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ, ПА КАЛГАСАХ—ПАД ЗНАКАМ МАКСЫМАЛЬНАГА ФАРСАВАНЬНЯ АПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА.

З 10-ГА САКАВІКА ПАЧЫНАЕМ МАСАВУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ ПА ЎСІМ РАЁНЕ. ВЫКЛІКАЕМ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ЎСЕ РАЁНЫ БССР—ПРАПАНУЕМ АРГАНІЗАВАЦЬ УСЕБЕЛАРУСКІ ІЛЬНЯНЫ АБОЗ.

САКРАТАР РАЙКОМУ ПАРТЫІ ШОЛАМАЎ.
СТАРШЫНЯ РВК ОРСІК.
СТАРШЫНЯ РАЙКАЛГАССАЮЗУ САВОСТАЎ.
Старшыні калгасаў: ШАДУРСКІ, ШКЛЯР.
Ударнікі: ПАШКЕВІЧ, ПАРУБІН, Х. І С. ЯКОВІЧ І ЖЫГАЧ.

Ударніцы па апрацоўцы валакна

КОЙДАНАВА.

У СУВЯЗІ З МІЖНАРОДНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНЕМ ТРАПАЛЬШЧЫЦЫ КАЛГАСУ «КАМІНТЭРН» ДЗЕМ'ЯНОВІЧ, БЕЛЬСКАЯ, ТАБУНЕВІЧ І ЯНКОЎСКАЯ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІЦАМІ ІМЯ 8-ГА САКАВІКА ПА АПРАЦОЎЦЫ І ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА ДЗЯРЖАВЕ.

Б. АГРАНОЎСКІ

Вырашэньне задач падрыхтоўкі кадраў— на вышэйшую ступень

Усебеларуская партыйная нарада па кадрах падагуліла вялізарныя посьпехі, якія дасягнуты КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, у галіне вырашэньне праблемы кадраў. Створаны шырокая сетка вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў, тэхнікумаў, рабфакаў, фабзавучаў, дзе рыхтуюцца пралетарскія спэцыялісты. Далкам апраўдаў сябе вопыт перадачы навучальных устаноў непасрэдна гаспадарчым арганізацыям. Няўхільна расьце і ўмацоўваецца партыйна-пралетарскімі, нацыянальнымі кіруючымі кадрамі ўсе галіны сацыялістычнага будаўніцтва.

Вырашэньню праблемы кадраў партыя аддае надзвычай многа ўвагі, бо барацьба за кадры разам з тым зьяўляецца барацьбой за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) 1929 г. даў вычарпальную дырэктыву аб тым, што «размах падрыхтоўкі кадраў, пачынаючы ад інжынэра і канчаючы кваліфікаваным рабочым, павінен адпавядаць агульнаму размаху сацыялістычнага будаўніцтва». XVI зьезд УсеКП(б) узьняў задачу стварэньня кіруючых, гаспадарчых і тэхнічных кадраў на вышэйшую цэнтральнай праблемы шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Зьезд катэгарычна ўказваў на тое, што «толькі пры далейшай мабілізацыі сіл усёй партыі і рабочае клясы вакол задачы падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочай клясы, толькі такі рашучым зруху ў гэтым абсягу можа быць забясьпечана далейшае правядзеньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны».

У 6 гістарычных умовах правадыра партыі тав. Сталіна з усёй выразнасьцю і вастрэтой пастаўлены ўсе тыя буйнейшыя задачы па стварэньні пралетарскіх кадраў, без пасьпяховага вырашэньня якіх НЕЛЬГА пераможна рухацца наперад у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Пастановы XVII партканфэрэнцыі, у якіх дасыта разгорнутая праграма пабудовы сацыялізму, патрабуюць значнага павялічэньня ўвагі да падрыхтоўкі кадраў.

Работа на кадрах павінна стаць важнейшай неадрыўнай часткай усёй пастаўнай работы, усёй работы гаспадарчых арганізацый. Заслугоўвае ўсямерпага пашырэньня вопыт заводу «Камунар», які ахапіў вучобай без адрыву ад работы вячэрнім тэхнікумам каля 25 проц. сваіх рабочых. Нарада рашуча асудзіла пэдацэнку вучобы без адрыву ад работы і паставіла баявой задачай максымальнае пашырэньне такой формы падрыхтоўкі кадраў, вячэрнепае філіялаў ВТНУ, ВНУ, рабфакаў і тэхнікумаў непасрэдна на вытворчасьці, на транспарце, у буйных саўгасах і калгасах.

***

Нарада спэцыяльна абмяркоўвала пытаньне аб становішчы і падрыхтоўцы кадраў для тарфяной і будаўнічай прамысловасьці гэтых дзьвёх важных галін, якія ў мінулым годзе толькі напалову выканалі вытворчыя пляны. Тарфяная і будаўнічая прамысловасьць зьяўляецца вядучымі галінамі народнай гаспадаркі БССР, а тэхнічныя кіруючыя і рабочыя кадры гэтых галін прамысловасьці зьяўляюцца найбольш слабымі. Адсутнасьць пастаянных замацаваных рабочых кадраў у гэтых галінах прамысловасьці, тлумачэньне «сэзоннасьцю», як прычынай, якая не дае магчымасьці замацаваць кадры, зьяўляецца толькі прыкрыцьцём наўменьня па-бальшавіцку змагацца за выкананьне прамфінпляну.

У 1932 г. пляцдле пляну павінна быць выпрацавана 1 млн. тон сухога торфу, 95 млн. цэгны. Партыя не можа дапусьціць такога ўдару, якім зьяўлялася ў мінулым годзе недавыкананьне работы тарфяной і будаўнічай прамысловасьці. На працягу тых некалькіх дзнаў, якія засталіся да пачатку разгорнутай работы па выпрацоўцы торфу і будматар'ялаў, трэба так падрыхтавацца, каб НА БЫЛО больш шыкох агаворак і спасылак на «абсалютныя» прычыны. Гэта баявая задача партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

У самыя бліжэйшыя дні павінна быць закончана комплектаваньне кіруючымі, гаспадарчымі кадрамі ўсіх торфаводаў і заводаў будматар'ялаў. Студэнты апошніх курсаў Торфінстытуту, керамічнага і хэміка - тэхналёгічнага тэхнікумаў павінны быць ужо зараз размеркаваны па заводах на ўвесь сэзон, адзначэньня з вытворчай праграмай пэўных заводаў, з работай, якая ім прадстаіць. Студэнты павінны будуць папоўніць нетахват тэхнічных кадраў у даных галінах прамысловасьці.

Райкомы і партыйныя ячэйкі тых раёнаў або вёсак, дзе вярбуецца рабочая сіла для тарфяной і будаўнічай прамысловасьці, павінны аказаць мак сымальную дапамогу і дабіцца таго, каб вярбоўка была ў тэрмін закончана, каб завербаваныя своячасова выехалі на работу. Райкомам і таркомам, дзе ёсьць торфаводы і заводы будматар'ялаў, трэба правесьці дасканалую праверку падрыхтаванасьці гэтых заводаў да сэзону, дабіцца зьнічэньня ўсіх наяўных недахопаў, на прадзіць пакучасьць рабочай сілы, узмацніць партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва.

Сапраўдны паварот партыйных, гаспадарчых і савецкіх органаў тварам да тарфяной і будаўнічай прамысловасьці забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне іх прамфінпляну ў 1932 г.

***

З вялікай увагай нарада прапрацавала пытаньне аб становішчы і мерапрыемствах па падрыхтоўцы, у сувязі з задачамі арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, кадраў брыгадзіраў, загадчыкаў фэрм і трактарыстаў.

Цяжкасьць калгасных брыгадзіраў і загадчыкаў фэрм была вельмі частым зьяўлічам. Партарганізацыі і калгасныя органы не зварачалі належнай увагі на падбор калгасных кадраў і на павышэньне іх палітычнай і агратэхнічнай кваліфікацыі. Плян падрыхтоўкі 20 тыс. брыгадзіраў да веснавой сяўбы выкапала на рэспубліцы менш чым на 20 проц. Зусім нездавальняючая работа ў гэтым кірунку Асьвейскага, Барысаўскага, Бешанковіцкага, Бягомльскага, Бялынічскага, Глускага, Жыткавіцкага, Кармянскага, Клічаўскага і Рэчыцкага раёнаў.

Нарада завастрыла ўвагу ўсіх партыйных арганізацый і калгаснай сыстэмы на тым, каб справа падбору, выдвіжэньня, замацаваньня, спэцыяльнага цякучасьці, павышэньня палітычнай і агратэхнічнай кваліфікацыі калгасных брыгадзіраў і загадчыкаў фэрм стала баявой, цэнтральнай задачай усёй іх работы, ад пасьпяховага вырашэньня якое залежыць арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Арганізацыя па БССР у пачатку сяўбы 44 новых МТС патрабуе 9 тыс. трактарыстаў. Рыхтуецца іх такуль толькі каля 5 тыс. Трэба дабіцца таго, каб у бліжэйшыя дні была арганізавана падрыхтоўка патрэбнай колькасьці трактарыстаў, бо інакш можа здарыцца такое становішча, што частка трактараў будзе стаяць з-за адсутнасьці рулявых.

***

Вялікае значэньне рабочага снабжэньня, рэгортваньне савецкага гандлю і загатоўчай дзейнасьці патрабуе пасіленьня справы падрыхтоўкі адпаведных кадраў.

Нарада падкрэсьліла, што ў Белкаапсаюзе і Наркамснабе ёсьць недасьцэнка і невыстарчальная ўвага па работы па кадрах, нездавальняючае фінансаваньне школ і г. д. Адзелы кадраў гэтых устаноў не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія стаяць перад імі.

Для пасьпяховага выкананьня задач, ускладзеных на спажывецкую кааперацыю, органы Дзяржгандлю і загатоўчыя арганізацыі, мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны каронным чынам зьмяніць свае адносіны да штотэннага кіраўніцтва, падбору, замацаваньня і падрыхтоўкі кадраў.

***

Пастаноўка на нарадзе пытаньня аб барацьбе з цякучасьцю кіруючых кадраў і аб стварэньні рэзэрваў была выклікана тым, што на радзе вучасткаў нашага будаўніцтва мы маем такую частую зьменнасьць работнікаў, якая надта дрэнна адбіваецца на выкананьні пляноў. На працягу 1931 году загадчыкі, напрыклад, райфа зьмяніліся па 3 разы ў 7-мі раёнах, па 2 разы ў 20 раёнах, па адным разе ў 35 раёнах; працуюць-жа бяз зьмен толькі ў 9-ці раёнах. Загадчыкі райза працуюць бяз зьмены толькі ў 12 раёнах. Райснабы працуюць бяз зьмены толькі ў 8 раёнах. У прамысловасьці з 85 дырэктароў прадпрыемстваў ВСНГ працуе бяз зьмены з 1-га студзеня 1931 г. 31 дырэктар, зьмяніліся па 3 разы на 7 прадпрыемствах, па 2 разы — на 12 прадпрыемствах і па адным разе — на 35 прадпрыемствах. Вялікая цякучасьць сярод кіруючых работнікаў ёсьць і на транспарце, асабліва сярод работнікаў раённых кіраўніцтваў чыгункі.

Нарада прызнала, што для пасьпяховага выкананьня народна - гаспадарчага пляну 1932 г. і другой пяцігодкі неабходна прыняць рашучыя і безадкладныя меры да спыненьня цякучасьці кіруючых кадраў і стварэньня належных умоў для іх замацаваньня і спэцыялізацыі.

З такой мэтай прызнана неабходным: яшчэ больш настойліва ажыцьцяўляць пастанову лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1929 г. аб тым, каб спыніць частае перакідваньне працаўнікоў, забясьпечыўшы ня менш 3-4 гадоў бесьперапынную працы на адным месцы; кожны кіруючы работнік павінен атрымаць поўную магчымасьць спэцыялізавацца, павышаць сваю кваліфікацыю і аўладаць тэхнікай у тэй галіне, у якой ён працуе, дзе ён праяўляе найбольшыя здольнасьці; забясьпечыць кватэрамі раённых работнікаў, палепшыць іх матар'яльна - бытавыя ўмовы і г. д.

У сувязі са шпаркім ростам усіх галін народнай гаспадаркі і вялікай патрэбнасьцю ў кіруючых кадрах, нарада паставіла задачу стварэньня розарваў, як адну з важнейшых па сучасным этапе пабудовы сацыялізму.

***

Нарада канстатавала, што большасьць вядомственных апаратаў па кадрах зьяўляюцца яшчэ вельмі слабымі і не спраўляюцца са сваімі задачамі. Асабліва нездавальняюча вядзецца па работа па выдвіжэньні кадраў і стварэньні розарваў. Сходзяваньне на «самацёк» зьяўляецца тут асабліва вялікім злом.

Зусім нездавальняюча вядзецца работа па плянаваньні падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў для ўсёй народнай гаспадаркі БССР.

Нарада ўказала, што работа па кадрах у радзе райкомаў вядзецца яшчэ толькі ад выпадку да выпадку, што сыстэматычнай работы тут няма. Райкомы і партыйныя ячэйкі павінны арабіць належныя палітычныя і практычныя выводы з работы і паста поў нарады. Ад таго, наколькі яны па - сапраўднаму разгорнуць работу па падрыхтоўцы кадраў і будуць правільна іх скарыстоўваць, залежаць посьпехі ў вырашэньні чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Перамагаючы труднасьці, якія ёсьць у справе падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, вялікі ўпартае змаганьне з самацёкам і нетаварыскай гэтай работы, у цэнтральнай пасьляпоўнай барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «левага» апартунізму, супроць прымірэньства і гнілога лібэралізму. КП(б)Б пад бальшавіцкім кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, даб'ецца далейшых перамог у вырашэньні праблемы кадраў.

Акупанты рыхтуюцца да атакі Нанкіну

Бамбардыроўка аэрадрому ў Суджоу

Японскі генштаб высоўвае новыя патрабаваньні

ТОКІЕ. Начальнік стратэгічнага аддзелу генеральнага штабу палкоўнік Камура, які прыбыў 5 сакавіка з Шанхаю, у інтэрвію з карэспандэнтам газэты «Ніцьі-Ніцьі» заявіў, што японская армія, кіруючыя стратэгічныя мерканьні, патрабуе патрабуе адводу кітайскіх войск з раёну паміж Шанхаем і вазёрамі, якія знаходзяцца на поўдні Шанхай-Нанкінскай чыгункі.

Раён рацыяе у 20 клм. вакол Шанхаю павінен быць абаронены у найтрадыцыйную зону, якая будзе ахоўвацца чужаземнымі войскамі, у тым ліку і японскімі. У раёне паміж нейтральнай зонай і вазёрамі кітайскія войскі маюць права знаходзіцца поллі часові, пагрыкла, у выпадку маскоўраў. Пастаянныя кітайскія гарнізоны ў гэтым раёне не павінны быць дапушчаны.

ЯПОНСКІЯ ВОЙСКІ ЗАНЯЛІ ХУАНДУ

ТОКІЕ. Паводле вестак шанхайскага карэспандэнта газэты «Ніцьі-Ніцьі», японскія войскі 5 сакавіка заняілі Хуанду (пункт на Шанхай-Нанкінскай чыгунцы). 5 сакавіка японская авіяцыя бамбардыравала кітайскі аэрадром у Сучжоу, а таксама і самы горад, прычым самыя густанаселеныя кварталы.

* * *

Ажыцьцяўляючы сваю гэнебную тактыку здрадніцтва і пазбаўляючы 19-ю армію, якая абаранялі Чапэй і Усун, падмацаваньняў і падтрыманьня, нанкінскія халопы імпэрыялістаў «спадзяваліся» на тое, што Японія будзе захоўваць умовы, высунутыя абобуму бакамі ў часе нядаўніх перагавораў. Умовы гэтыя, сфармуляваныя пад дуламі гармат на англійскім параблі і ўхваленыя Японіяй, зводзіліся да таго, што японскія войскі ў кожным выпадку спыняць далейшае наступленьне, калі кітайскія часьці адступяць на адлегласьць 20 клм. ад Шанхаю.

У рэзультаце здрадніцкіх дзеяньняў Нанкіну, кітайскія часьці адступілі на другую лінію абароны, г. зн. выканалі ўмовы, неабходныя для спыненьня ваенных дзеяньняў. АЛЕ ЯПОНСКІЯ ЗАХВАТЧЫКІ, ЯК ГЭТА БЫЛО ЗУСІМ ЯСНА ЯШЧЭ ДА ЭВАКУАЦЫІ КІТАЙСКІХ ВОЙСК, ПЛЮЮЦЬ НА ВЫСУНУТЫЯ ІМІ-Ж УМОВЫ І НАСТУПАЮЦЬ ДАЛЕЙ. У той час, як японскі дэлегат Жэнэве Мацудайра прыкрывае наступленьне, якое вядзецца, фігавым лістком тэрмінам «дробныя сутычкі», японскае камандаваньне вядзе гэтае наступленьне

Аб чым усё гэта сьведчыць? Толькі аб тым, што японскія імпэрыялісты пры поўным падтрыманьні Лігі нацый, зусім ня маюць намеру абмежавацца ўжо дасягнутым і наступаюць далей. Імі высоўваецца праект «інтэрнацыяналізацыі» (чытай «захвату») Шанхаю. Праект гэты падтрымліваецца некаторымі «вялікімі драпежнікамі». Сьледам за гэтым праектам Японія сьпяшаецца высунуць новы плян дэміліторызацыі ўсіх буйнейшых кітайскіх цэнтраў, г. зн. фактычнага падпаўненьня ўсяго Кітаю і падзелу яго паміж зацінаўленымі драпежнікамі. Уресь сэнс наступленьня японскіх часьцей у глыбіню краіны заключаецца ў тым, каб прыцісьнуць Нанкін да сьцяны і паставіць яго ў такое становішча, пры якім ён не адважыўся-б і пікнуць у МОМАНТ ПАДЗЕЛУ ТЭРЫТОРЫІ УСЕЙ КРАІНЫ.

Аднак, як у часе баёў на шанхайскім фронце, так і зараз японскія імпэрыялісты, з розам з імі і ўсе іх апякуны ня ўлічваюць такога магутнага фактару, як нацыянальна-вызвалечы рух мас. Апошнія магутныя дэманстрацыі ў Шанхэі сьведчаць аб тым, што шырокія працоўныя масы выступаюць на тоўкі супроць імпэрыялістаў, але і супроць іх нанкінскіх лёкаў. Кожны новы дзень адкрывае масам вочы на сапраўднае становішча рэчаў.

Гераічная барацьба 2-тысячнага гарнізону

ШАНХАЙ, 6. 4сакавіка 2.000 салдат гарнізону Усуна адмовіліся падначаліцца загаду аб эвакуацыі і аказалі японцам моцнае супраціўленьне, што затрымала занятьце японцамі Усуна на некалькі гадзін. Паміж гэтымі салдатамі і японцамі адбыўся «крывавы бой з вялікімі стратамі. Салдатам удалося прарвацца скрозь японскія лініі і прайсьці ў Люхэ, адтуль дасягнуць новых пазыцый Цай Цін-кая.

У гонар гэтага гераічнага ўчынку, а таксама, каб паказаць Нанкіну наколькі Шанхай падтрымлівае 19 армію, камандаваньне арміяй папаўнила народную ўрачыстасьць. Зараз высьвятляецца, што Цай Цін-кай двойчы аддаваў загады аб эвакуацыі. Аднак, салдаты двойчы адмаўляліся падначальвацца загадам. Пасьля гэтага Цан-Цін-кай прыгразіў салдатам, якія адмовіліся паміраць пазыцыі, і толькі пасьля гэтай пагрозы пачалася эвакуацыя (ТАСС).

Крызіс японскага габінэту

ТОКІЕ, 3. Канфлікт габінэту з тайнай радай паскорыў працэс крызісу габінэту. Лічыцца шматчай разгаліцца ўрэду Сэйюкайя. У палітычных колах мяркуюць, што сэйюкайскі ўрад будзе зьменен «нацыянальным урадам», які будзе падтрымліваецца Мінсэйто і Сэйюкай.

Адозва палітбюро ангельскай кампартыі

ЛЁНДАН, 5. Апублікавана адозва палітбюро ангельскай кампартыі з прычыны падзей на Далёкім Усходзе. У адозве ўказваецца, што пажар, які пачаўся на Далёкім Усходзе, можа ў кожную мінуту пашырыцца на ўвесь сьвет. Адозва ўказвае: «без падтрыманьня ангельскага імпэрыялізму з яго магутным флётам, Японія ня была-б у стане весьці гэту вайну ў такім маштабе, як зараз».

Адозва заклікае рабочую клясу Англіі да барацьбы супроць ангельскіх кіруючых клясаў, да падтрыманьня кітайскіх рабочых, якія вядуць нацыянальна-рэвалюцыйную вайну, і падкрэсьлівае, што рабочая клясаня дзейнічаць, ня трацячы часу. «Кожную хвіліну,—сказваецца ў адозве,— вайна, якая адбываецца ў цяперашні час на Далёкім Усходзе, можа ператварыцца ў вайну супроць Савецкага Саюзу, або ў сусьветную вайну паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі».

Адозва далей падкрэсьлівае, што барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны цесна сьвязана з барацьбой за паляпшэньне эканамічнага становішча рабочага. Барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны, выступленьні на падтрыманьне Кітаю ўмацоўваць сілы рабочых для барацьбы супроць наступленьня капіталістаў на жыцьцёвы ўзровень працоўных, супроць зьніжэньня зарплаты, супроць «праверкі патраб беспрацоўных» і г. д. Адозва канчаецца наступным заклікам:

«Рабочыя Англіі, скапцентруйце свае сілы для рашучай барацьбы супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні, рыхтуйцеся да дня дэманстрацыі і барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны. Выпаўшы на суліцу дзесяткамі тысяч, мы прымусім капіталістаў і іх лёкаў укрыгнуцца перад нашай рэвалюцыйнай рашучасьцю. Днём дэманстрацыі супроць імпэрыялістычнай вайны палітбюро ангельскай кампартыі назначыла 20 сакавіка. (ТАСС).

„За сьпіною Японіі стаіць Францыя"

Н'Ю-ЁРК. Парыскі карэспандэнт штотыднёвіка «Нэйшэн» Робэрт Дэль указвае, што пазыцыя французкага ўраду і рад іншых даных сьведчаць аб падтрыманьні Францыяй дзеяньняў Японіі ў Кітаі. Дэль пярэчыць супроць думкі, што Францыя перш за ўсё шукае падтрыманьня Японіі на канферэнцыі па раззбраеньні, указваючы, што «Японія ва ўсякім выпадку адмовіцца ад скарачэньня сваіх узбраеньняў».

«Значна больш магчыма, — піша Дэль,— што Францыя жадае, каб Кітай падпаў пад панаваньне Японіі з тым, каб была зьнішчана магчымасьць апору Савецкага Саюзу. Калі-ж японскія дзеяньні павядуць (што амаль напэўна будзе, калі Японіі ня будуць ставіць перашкод) да вайны паміж Японіяй і СССР і, значыць, да перарыву ў выкананьні пяцігодкі, дык гэта не выклікае вялікага жалю ў Парыжы. Брыянаўскі праект «Пан - эўрапейскага саюзу» меў па замысле антысавецкі і бяз сумненьня антыамэрыканскі характар. Брыян ужываў вялікія намаганьні, каб зьключыць СССР з гэтага саюзу і адступіў толькі тады, калі быў вымушан гэта зрабіць. Другі праект, які цесна зьвязан з брыянаўскім і ў вялікай ступені падтрымліваецца Францыяй,— «Пан - Эўропа» графа Кудзенгове - Калергі,— быў напэўна накіраван, па мысьлі яго аўтара, супроць СССР, з аднаго боку, і супроць Англіі і Амэрыкі—з другога. Граф Кудзенгове - Калергі, кладучы апублікаваў памфлет, які не пакідае сумненьняў у яго мэтах. Кудзенгове-Калергі заклікае ўсе эўрапейскія краіны і ўсіх эўрапейцаў - сацыялістаў і капіталістаў, нацыяналістаў і інтэрнацыяналістаў, дэмакратаў і фашыстаў— АБ'ЯДНАЦЦА СУПРОЦЬ САВЕЦКАЙ РАСІІ. Ён заклікае іх задушыць дзейнасьць кампартыі і камуністычную прапаганду ва ўсіх краінах, арганізаваць сумесны эканамічны байкот Савецкага Саюзу, стварыць «раду эўрапейскай абароны» і «армію эўрапейскага саюзу» ДЛЯ ВЯДЗЕНЬНЯ ВАЙНЫ З СССР І ЗЬНІШЧЭНЬНЯ БАЛЬШАВІЗМУ І ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ. Граф Кудзенгове - Калергі, які быў у Парыжы, 1 лютага быў прынят разам з былым румынскім міністрам народнай асьветы Рустанам. Можна думаць, што ён наведаў і ваенкае міністэрства. Бяз сумненьня, ён гэта зрабіў».

«Магчыма таксама,— піша далей Дэль ,—што афіцыяльная Францыя была-б нездаволена ўскладненьнямі між Японіяй і Злучанымі Штатамі. Ва ўсякім выпадку ясна, што незалежна ад таго, існуе фармальная франка - японская згода, ці не, ЗА СЬПІНОЙ ЯПОНІІ СТАІЦЬ ФРАНЦЫЯ. (ТАСС).

Крывавая расправа з рабочай моладзьдзю ў Варшаве

ВАРШАВА,6. Учора ў Варшаве адбылася рабочая масоўка, у якой прымала ўдзел больш 400 чал., пераважна моладзі На масоўцы выступілі з чырвонымі прамовамі два прамоўцы, пасьля чаго была выкладжана дэманстрацыя з чырвоным плякатам.

Раптам пачувася некалькі стрэлаў. Пейні агент паліцыі ў цывільным пачаў страляць з рэвальвэру ў натоўп. Было пана каля 12 стрэлаў. Прыбыўшыя паліцэйскія праследавалі ўцякаючых дэманстрантаў і правялі арышты. На бруку засталося некалькі цяжка параненых рабочых.

Прэч лікчаваньне і прыгнечаньне нэгоыцянскіх мас

Працоўныя Віцебшчыны пратэстуюць

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Заньвярджэньне сьмяротнага прыгавару над 8 маладымі, ні ў чым неасвядамлымі нэграмі, ўзьняло сярод працоўных Віцебшчыны магутную хвалю пратэсту.

Рабочыя, служачыя і адміністрацыйна-тэхнічны персанал заводу «Чырвоны металіст» рашуча пратэстуюць супроць яверскага прысуду амэрыканскага капіталу і катэгарычна патрабуюць яго скасаваньня і вызваленьня асуджаных.

У адказ на разгортваньне белага тэрору ў Амэрыцы, металісты абяцаюць яшчэ больш рашуча перакліцьця на пасьпяховы і добраякасны выраб пасеўных машын, узмацненьне сувязі з паліцязьнямі сваёй падпіфнай турмы.

Далучаючы свой голас да агульнага пратэсту пралетарыяту Савецкага Саюзу, супроць жаданьня капіталістаў паліцыі у крыві рэвалюцыйны рух пралетарыяту Амэрыкі, шэйнікі гіганта «Сьцяг індустрыялізацыі» — 4.500 чал. узялі на сябе абавязак павялічыць свае тэмпы ў галіне выкананьня палітычна-гаспадарчых задач чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, узмацніць інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу і сувязь з замежным пралетарыятам.

Свой пралетарскі пратэст супроць бесчалавечнага лютага прысуду амэрыканскага фашызму вынесьлі 2.500 рабочых і служачых фабрыкі «Прафінтэрн». Прафінтэрнаўцы, выканаўшы свой пяцігадовы плян за тры гады, абяцаюць усе свае сілы аддаць на пасьпяховае выкананьне вытворчых заданьняў чацьвертага, заключнага. Узмацніць работу МОПР'у, пакрыць запазычанасьць па членскіх узносах, з посьпехам правесьці другую інтэрнацыянальную эстафету — вось канкрэтныя інтэрнацыянальныя абавязкі, узятыя прафінтэрнаўцамі ў адказ на амэрыканскі тэрор.

Абураныя дзікім прысудам амэрыканскіх капіталістаў над 8 нэграмі, рабочыя і служачыя шчаціннага камбінату, пратэстуючы супроць прыгавару, шлюць сваё братэрскае пралетарскае прывітаньне рабочым Амэрыкі, якія ўпарта змагаюцца за зьнішчэньне капіталістычнага ладу. «Мы абяцаем, — заяўляюць шчаціннікі, — у адказ на крывавы прысуд над нэграмі паставіць на вышэйшую ступень работу МОПР'у і пераключыць на баявыя тэмпы работу мопраўскіх гаспадарча-разрахункавых брыгад.

Такія-ж пратэсты вынесьлі рабочыя, чыгункі, фабрыкі «КІМ», вучні і настаўнікі школ фабзавучаў, рабфакаў і тэхнікумаў. Віцебскі гарком МОПР'у ў адказ на прыгавар над 8 нэграмі разгарнуў работу па падрыхтоўцы да сяўбы. Ва ўсе сельсаветы пасланы брыгады, закуплен трыер для ачысткі насеньня. Гарком МОПР'у таксама накіроўваецца ў калгасы кавальскія рэмонтныя брыгады.

Вясковы мопраўскі актыў адначае свой пратэст дадатковым распаўсюджаньнем пазыкі «3-ці рашаючы». За час правядзеньня пратэсту дадаткова распаўсюджана пазыкі на 5.600 руб.

Арк. Зарубежны

Недамо загінуць нашым братом па клясе

Першая ўсебеларуская канфэрэнцыя саюзу МТС і батрацтва ад імя 25.000 асоб з абураньнем пратэстуе супроць падрыхтоўкі крывавай расправы капіталістаў Амэрыкі над лепшымі барацьбітамі рэвалюцыі — 8 маладымі рабочымі-нэграмі.

Сьмяротны прыгавар над 8 нэгрыцянскімі рабочымі цесна зьвязан з ваенай небясьпекай. Шляхам тэрору, шляхам фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыйных барацьбітоў капіталісты прымушаюць працоўныя масы выкошваць іх ваенныя планы.

У знак салідарнасьці з барацьбой амэрыканскага пралетарыяту і ў адказ на сьмяротны прыгавор над 8 рабочымі-нэграмі ў Скотсборо, канфэрэнцыя ўносіць у фонд МОПР'у для дапамогі замежным барацьбітом 150 руб. 50 кап. і выклікае ўсе прафарганізацыі Беларусі.

Апрача гэтага рэвалюцыі пратэсту супроць падрыхтоўкі крывавай расправы над маладымі нэгрыцянскімі рабочымі атрыманы яшчэ ад агульнага сходу студэнтаў і настаўнікаў палітэхнікуму, ад студэнтаў і выкладчыкаў Будаўнічага інстытуту, ад студэнтаў Менскага вучэбнага камбінату Саюзтранс і інш.

10 САКАВІКА—УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЭТ

10 сакавіка, у 5 гадз. веч., у памяшканьні залі ЦК КП(б)Б

сьлікаецца

чарговая ўсебеларуская нарада рэдактароў раённых газэт разам з камуністамі-работнікамі цэнтральных газэт.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Задача друку ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі—даклядчык сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ і суданлад тав. КУРЦІКА аб чарговых задачах работы на конкурсе „Правды".

2) Барацьба за марксыцка-ленінскае выхаваньне і задачы друку даклядчык—тав. ЗАЛАТУХІН.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

На агратэхнічным зьезьдзе

Барацьбу са стратамі—у практыку штодзеннай работы

Усебеларускі агра-зоатэхнічны зьезд прыступіў да дзелавой работы. Народны намісар земляробства БССР т. Рачыцкі ў сваім вялікім дакладзе спыняецца на задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, авладаньня агра-зоатэхнікай, павышэньня ўраджайнасьці і ролі спэцыялістаў.

Пасьля дакладу тав. Рачыцкага, які працягваўся амаль усё вячорняе пасяджэньне 5-га сакавіка і часткова на ранішнім пасяджэньні 6 сакавіка, разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Рад прамоўцаў прысьвячаюць свае выступленьні агранамам цэнтральных і раённых устаноў. Аграному прад'яўляецца пэўны «рахунак».

Загадчык Рачыцкага райзэ тав. РЫМАЎ проста заяўляе, што асноўныя нашы спэцыялісты ня бываюць у калгасах.

У райзе цэнтральных устаноў Менску СЯДЗІЦЬ КАЛЯ ТЫСЯЧЫ АГРАНОМАЎ. Ня меншая колькасьць знаходзіцца і ў раённых установах. Але канкрэтнай практычнай работы яны не вядуць. У такім раёне, як Рачыцкі, дзе ёсьць 35 сельсаветаў, рэдка можна ўбачыць спэцыяліста з цэнтру.

Тав. РАМАНАЎ (загадчык Магілеўскага райзэ) прыводзіць рад фактаў, калі аграномы бягуць з вытворчасьці. У Магілеўскім раёне рад спэцыялістаў працуюць бухгальтарамі, каналізатарамі, але толькі не па сваёй галіне.

Тав. БАРЫСЕНАК з Мазыршчыны падкрэсьлівае, што ўеляньне севазваротаў у калгасах, арганізацыя рабочай сілы па брыгадным мэтадзе патрабуюць актыўнай дапамогі агранома.

Дэлегаты ПАРОЖКІН І КАБАЛОЎСКІ завастраюць увагу зьезду на барацьбе са стратамі ў сельскай гаспадарцы, асабліва са стратамі, якія наносяць шкоднікі сельска-гаспадарчых расьлін.

Спыняючыся на мэтадах барацьбы, тав. Дарожкін падкрэсьлівае, што некаторыя нашы саўгасы, нават дасьледчыя станцыі, зусім ігнаруюць прафілактычныя меры барацьбы, як уборка качаражак з поля, загніўшых пладоў і г. д.

Пытаньне, высунутае тав. Рачыцкім аб павялічэньні прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі на 25 проц., тав. Кабалоўскі лічыць зусім рэальным і магчымым да выкананьня. Для гэтага барацьба са стратамі ў сельскай гаспадарцы павінна стаць штодзённай сыстэмай работы.

Супрацоўнік гідрамэтэарасьпістычнага інстытуту тав. ЛЕЙБКАЎ спыняе ўвагу зьезду на значэньні прадраканьня надвор'я для ўзьнімцьця ўраджайнасьці. Да гэтай справы ў нас наглядаюцца яшчэ абыватальскія адносіны. Між тым, за апошнія гады ў справе прадраканьня надвор'я дасягнуты вялікія посьпехі. Напрыклад, праўдападобнасьць прадраканьняў цэнтральнага бюро надвор'я ў сярэднім дасягае 75-80 проц. Праўдападобнасьць прадраканьняў беларускага бюро надвор'я на суткі ўперад за студзень складае 80 проц. Умелае карыстаньне прадраканьнямі бюро надвор'я нашымі саўгасамі і калгасамі можа прынесьці вялікую карысьць у барацьбе са стратамі і павышэньнем ураджайнасьці.

Хроніка зьезду

На ранішнім пасяджэньні 7 сакавіка працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Рачыцкага. Большая частка дэлегатаў у сваіх прамовах спынялася на пытаньнях узьнімцьця ўраджайнасьці, хэмізацыі сельскай гаспадаркі і ўкараненьня агратэхнічных ведаў у шырокія калгасныя масы.

У канцы пасяджэньня з заключным словам выступіў Наркамзем БССР тав. Рачыцкі.

На вячорнім пасяджэньні зьезд заслухаў даклад старшыні Калгасцэнтру БССР тав. Міцькова аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і ролі спэцыялістаў.

ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ ВСНБ

за студзень і люты месяцы 1932 г.

Паводле даных ВСНГБ, прамысловасьць ВСНГ выканала свой плян па валавой прадукцыі за студзень месяц на 76,8 проц.; за люты — на 83,4 проц.

ТАРФЯНАЯ прамысловасьць выканала сваю вытворчую праграму за студзень на 42,4 проц. і за люты — на 50 проц.

МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала свой плян за студзень на 78,9 проц., за люты—на 91,5 проц., у тым ліку завод «Пралетары» даў выкананьне 106,2 проц. студзеньскага і 96,3 проц. пляну за люты; завод імя Варашылава — 101,5 проц. студзеньскага і 76,8 проц. за люты. Завод «Камунар» —84,8 проц. за студзень і 79,3 проц. за люты; завод імя Сталіна — 101,8 проц. за студзень і 76,5 проц. за люты; завод «Чырвоны здраджэнец — 72,7 проц. і 103,7 проц.; «Чырвоны металіст» — 73,1 проц. і 89,5 проц.; Гомсельмаш — 64,8 проц. у студзені і 119,1 проц. у лютым; «Камінтэрн» — 89,6 проц. і 89,6 проц.; «Рухавік рэвалюцыі» — 102 проц. і 139,6 проц.; «Чырвоны Кастрычнік» — 73,7 і 77,4 проц.; «Інтэрнацыянал» — 88,1 проц. і 81,5 проц.; іголкавая фабрыка—79,3 і 81,9 проц., завод «Ударнік» — 52,7 проц. і 29,3 проц. за люты; акупэрная фабрыка — 60,9 проц. і 91,7 проц.

ХЭМІЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала сваю вытворчую праграму за студзень на 84,3 проц. і за люты на 97 проц., у тым ліку завод «Чырвоны хімік» даў выкананьне ў студзені 82,5 проц. пляну, у лютым — 85,9 проц.; плакавы завод — 95,2 проц. і 90,9 проц., завод сухіх фарбаў — 70,7 проц. і 72,8 проц.; крэйдавы завод — 65 проц. і 76,3 проц., Крычаўскі фасфарытны завод — 72,1 проц. і 57,9 проц., галянтарэйная ф-ка — 83,2 проц. і 111,1 проц.

КЕРАМІЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ дала выкананьне вытворчай праграмы ў студзені на 89,1 проц., у лютым на 39,8 проц.

ДРЭВААПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала свой прамфінплян за студзень месяц на 103,1 проц., у лютым за 102,5 проц., у тым ліку «Дняпро» — 100,3 проц. у студзені і 100 проц. у лютым; «Вэзэўі» — 108,7 проц. у студзені і 105 проц. у лютым; камбінат «Бярэзіна» — 103,1 проц. у студзені і 103 проц. у лютым.

ГАРБАРНА-АБУТКОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала сваю вытворчую праграму за студзень на 79,9 проц. і ў лютым на 87,1 проц., у тым ліку гарбарня «Бальшавік» дала выкананьне пляну ў студзені на 107,8 проц., у лютым на 107 проц., віцебская гарбарня — 123,5 проц. у студзені і 124 проц. у лютым, гомельская гарбарня — 87,2 проц. у студзені і 99 проц. у лютым; магілеўская гарбарня — 123,8 проц. у студзені і 106,7 проц. у лютым, рымарная фабрыка — 86,6 проц. у студзені і 92,3 проц. у лютым, менская абутковая фабрыка—84,6 проц. у студзені і 64,8 проц. у лютым, віцебская абутковая — 64,5 проц. у студзені і 51,6 проц. у лютым, гомальская абутковая фабрыка — 55,7 проц. у студзені і 94,8 проц. у лютым, скурана-галантарэйная фабрыка — 72 проц. у студзені і 87 проц. у лютым.

ПАПЯРОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала свой плян за студзень на 60,8 і за люты — за 57,4 проц., у тым ліку ф-ка «Герой працы» — 63,4 проц. у студзені і 54,8 проц. у лютым, «Спартак» — 66,6 проц. у студзені і 58,3 проц. у лютым, «Чырвоная зорка» — 33,7 проц. у студзені і 49,3 проц. у лютым, «Прафінтэрн» — 83,1 проц. у студзені і 88,2 проц. у лютым, імя Сталіна — 94,7 проц. у студзені і 74,9 проц. у лютым, імя Варошыскага — 102,5 проц. у студзені і 61,9 проц. у лютым, імя Леніна—96,5 проц. уступзені і 100,5 проц. у лютым.

ШКЛЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ дала выкананьне вытворчай праграмы ў студзені на 104,5 проц. і ў лютым на 99,6 проц. у тым ліку завод «Камінтэрн» — 110,9 проц .у студзені і 112,2 проц. у лютым, імя Дамбаля — 100,7 проц. у студзені і 103,3 проц. у лютым, «Кастрычнік» — 104,6 проц. у студзені і 85,4 проц. у лютым, завод «Ільліч» — 64 проц. у студзені і 85,9 проц. у лютым, завод «Пралетары» — 102,8 проц. у студзені і 118,9 проц. у лютым.

ТЭКСТЫЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала свой плян у студзені на 70,8 проц. і ў лютым на 75,4 проц., у тым ліку фабрыка «Дзьвіна» — 51,4 проц. і 83,6 проц. у лютым, К. Маркса — 90,9 проц. у студзені, 90,7 проц. у лютым, «Дняпроўская мануфактура» — 47,8 проц. у студзені і 59,7 проц. у лютым, Якаўлевіцкая суконная фабрыка — 47,3 проц. у студзені і 41,7 проц. у лютым, панчошная нумар 1 — 84,3 проц. у студзені і 82,1 проц. у лютым, панчошная нумар 2 — 61,2 проц. у студзені і 61,6 проц. у лютым.

ШВЭЙНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ дала выкананьне вытворчай праграмы ў студзені на 74,7 проц. і ў лютым на 83,3 проц., у тым ліку фабрыка «Настрычнік» — 87,7 проц. у студзені і 101,2 проц. у лютым, «Сьцяг індустрыялізацыі» — 52,7 проц. у студзені і 69 проц. у лютым, «Прафінтэрн» — 83,9 проц. у студзені і 83,6 проц. у лютым, «Камінтэрн» — 69,8 проц. у студзені і 101,7 проц у лютым, імя Валадарскага — 87,7 проц. у студзені і 94 проц у лютым, імя Дзяржынскага — 68,6 проц. у студзені і 71,7 процантаў у лютым, імя Крупскай — 84,2 процантаў у студзені і 100,7 процантаў у лютым, «8-га сакавіка» — 72,7 проц. у студзені і 103,1 проц. у лютым, фабзавуч «КІМ» — 55,2 проц. у студзені і 86 проц. у лютым, фабзавуч «Х.-ц.-годзьдзя Кастрычніка» — 90,3 проц. у студзені і 28,2 проц. у лютым.

КУШНЕРНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала сваю вытворчую праграму на 88,4 проц. у студзені і 83,1 проц. у лютым.

ЗАПАЛКАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала прамфінплян за студзень на 94,9 проц. і за люты на 88 проц., у тым ліку «Х.-ы Кастрычнік» — 88,8 проц. у студзені і 92 проц. у лютым, «Вэзэўі» — 85,2 проц. у студзені і 83,6 проц. у лютым, «Пралетарская перамога»—104,5 проц у студзені і 98 проц. у лютым.

ПАЛІГРАФІЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ дала выкананьне праграмы ў студзені на 82,2 проц., у лютым на 92,4 проц., у тым ліку друкарня імя Сталіна — 86,1 проц. у студзені і 94,2 проц. у лютым, «Пагеедрук» — 92,7 проц. у студзені і 90 проц. у лютым, віцебская друкарня — 100 проц. у студзені і 79,3 проц. у лютым, магілеўская друкарня — 96,8 проц. у студзені і 96,8 проц. у лютым, бабруйская друкарня — 136,8 проц. у студзені і 136,7 проц. у лютым, барысаўская друкарня — 88,9 проц. у студзені і 107 проц. у лютым, шпалерная фабрыка — 42,3 проц. у студзені і 91,1 проц. у лютым.

Люты месяц у проц. адносінах да студзеня 1932 году паказвае 105,4 проц.

Да сьвяткаваньня міжнароднага жаночага дня

Пастанова Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 7-га сакавіка 1932 г.

У мэтах пасьпяховага правядзеньня 3-й бальшэвіцкай сяўбы, уцягненьня ў гэту работу ўсяе жаночае сілы калгасаў і саўгасаў, прэзыдыум гарсавету ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць інспэкцыі Аховы Здароўя і аддзелу Нарасьвяты не пазьней 1-га мая г. г. адкрыць у раёне 118 ясьлей — пляцован (з іх у саўгасах — 24 і ў калгасах — 94) з агульным лікам ахопу 4.772 дзяцей ва ўзросьце да 4-х год і 5.150 дзяцей ва ўзросьце 4—7 год. Гэта складзе ахоп дзяцей дашкольнага ўзросту часовымі пляцоўкамі на 100 проц., а сталымі дзіцячымі садамі на 50 проц., у адносінах-жа дзяцей ясельнага ўзросту ахоп часовымі ясьлямі — 65 проц. і сталымі ясьлямі — 35 проц.

2. Для ажыцьцяўленьня гэтага вызначыць па бюджэце Гарана — 63.000 руб. і па бюджэце Гарздраву — 25.950 руб., прапанаваўшы інспэкцыям уцягнуць у гэту справу сродкі грамадзкіх арганізацый: т-ва «Прыхільнікі дзяцей» — 20.000 руб., т-ва «Чырвонага Крыжу» — 15.000 руб., райспажыўсаюзу — 3.000 рублёў і ЦК МОПР'у — 2.000 руб.

3. Абавязаць усе сельсаветы, райкалгассаюзы, калгасы і саўгасы зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу да адкрыцьця пляцовак, ясьляй, забясьпечыць іх адпаведнымі памяшканьнямі і абсталяваньнем, вызначыць спэцыяльныя фонды мясцовых праўктаў для харчаваньня дзяцей і выпучыць асоб, адказных за арганізацыю гэтае справы.

4. Даручыць гарснабу і райспажыўсаюзу вызначыць адпаведную колькасьць адзеньня, абутку, пасуды і прадуктаў харчаваньня (цукар, мыла і г. д.) для забясьпячэньня ясьляй-пляцовак.

5. Інспэкцыі Аховы Здароўя арганізаваць справу забясьпачэньня ясьляй і пляцовак цацкамі.

Старшыня гарсавету ВАЛОДЗЬКА.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьне

Сёньня, 8 сакавіка, у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ЦВК БССР (Пляц Волі) склікаецца нарада ўпаўнаважаных культпропу ЦК КП(б)Б, якія выяжджаюць у раёны па дакладнаму ліквідацыі нэпісьменнасьці. На нараду выклікаюцца т.т. Башкавіч, Баброў, Казалёў, Сяргейчык—ЦК КП(б)Б, Брыкневіч, Чорнабродаў, Шамшур, Сініцкі, Акулік, Нарэйка, Паноў, Дабравольскі, Чарноў, Суворaў, Лазарчык, Позьняк, Бурачкоў, Гайдук, Хмыз, Ходараў, Ходарава, Тарайковіч, Захарын, Падальніцкі, Раманавіч, Казакоў, Дзяржынская, Рабцэвіч, Южык, Галяўцоў, Гуцэвіч, Заброцкі — НКАсьветы, Сьвярдлоў, Малашэвіч, Левін, Зарэмбоўскі, Дварэцкі — ЦСПСБ, Мазур — СНК, Калмык, Сідліна — Калгасцэнтр, Сіманенка — ЦС АСО, Науменка — Радыёцэнтр, Мікуліч — саўбуд, Дамесон — газ. «Акцябр» і інш. т. т., якія выяжджаюць ад штабу.

2-гі Менскі гарадзкі зьезд прафсаюзаў

адкрываецца 8 сакавіка, у 6 гадз. веч., не ў клюбе металістаў (як было абвешчана раней) а ў **Доме намаскоўных імя Карла Маркса.**

ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклад ЦСПСБ.
2) Справаздача ГСПС (тав. Шульгін).
3) Справаздача рэвакомісіі (т. Варончаня).
4) Народна-гаспадарчы плян на 1932 г. (т. Валодзька).
5) Рабочае забясьпячэньне і становішча прыгарадных гаспадарак (т.т. Гантман і Шлейфер).
6) Справаздача Гарстрахкамітэту (т. Гнедзько).
7) Выбары.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

СЁНЬНЯ, 8 САКАВІКА | І ШТОДЗЕННА

МОНЦІ БЭНКС

У ЗАМЕЖНЫМ ФІЛЬМЕ

ХАЧУ БЫЦЬ РЭПАРЦЁРАМ

Пачатак сэансаў у 2 гадз., 3-30, 5-30, 6-50, 8-10, 9-30 і 10-50

КАСА—з 12 гадз. дня.

Чырвоная Зорка — Замежны фільм **„ТЭМБІ"** (дразнення Афрыканскіх джунгляў)

Інтэрнацыянал — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **Месяц зьлева**

СПАРТАК — **ЧАШКА ЧАЮ** каждыя ў 6 ч. Звыш праграмы **КІНО-МЯТЛА** ў 2 частках.

АНОНС!

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Толькі 3 дні—10, 11 і 12 сакавіка гукавая праграма

1. КЕМ БЫЦЬ? мастацкі фільм у 4 частках.

2. ПОШТА мастацкі фільм у 2 частках.

Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня і 2 гадз. 30 м. Каса—ад 11 гадз.

Цэны на дзенныя сэансы зьменшаны.

Сэнтар прамкадраў ВСНГ БССР паведамляе, што

1-Я Усебеларуская канфэрэнцыя школ ФЗВ прамысловасьці ВСНГ і саюзных аб'яднаньняў

адкрываецца 11 сакавіка г. г., у 6 гадз. веч., У КЛЮБЕ МЭТАЛІСТАЎ.

Сэнтар прамкадраў ВСНГ БСС